

**На журфак у 73 гады**

СТАР. 3



**Што трэба, каб зарэгістраваць зброю?**

СТАР. 4



**Дзе Рэпін стварыў карціну “Беларус”?**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 мая 2014 г. СЕРАДА № 97 (27707) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПОЎНАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ

Прэзідэнт патрабуе поўнай аддачы на нарыхтоўцы кармоў і вырашэння праблемы са свінінай

**Гэтыя патрабаванні прагучалі ад кіраўніка дзяржавы падчас наведвання РУП «Шыпяны — АСК» РУП «НПЦ НАН Беларусі па земляробстве» ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка пабываў на кармавым полі гаспадаркі, азнаёміўся з узорамі занятай на ўборцы кармоў тэхнікі беларускай вытворчасці. Прэзідэнт падрабязна цікавіўся структурай кармоў, а таксама прычынамі правалу ў мясной і малочнай жывёлагадоўлі.

«Мы ўсе ведаем, як трэба рабіць, але з-за расхлябанасці часам губляем велізарныя грошы!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, сельская гаспадарка летась недаатрымала Br7 трлн толькі ад работы малочнай галіны. «А лічы — усе Br20 трлн! Гэта тыя грошы, якія сёння патрэбны сельскай гаспадарцы. І хадзіць не трэба ні ў каго прасіць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна максімальна выкарыстаць спрыяльныя ўмовы надвор'я для эфектыўнага правядзення корманарыхтоўкі. Галоўнае пытанне цяпер — гэта хімічная прaполка. «Такая вільгаць спрыяе хваробам і хуткаму прарастанню пустазелля. Таму трэба абараніць расліны. Вось гэта жалезабетонна трэба зрабіць! Калі не зробім, мы страцім ўраджай, у траве пакінем увесь хлеб», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Усіх перавесці на ваеннае становішча да ўборкі, асабліва збажыны! Страцім — не возьмем. Тое ж тычыцца і нарыхтоўкі кармоў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Усе павінны быць мабілізаваны на нарыхтоўку кармоў! Хопіць потым хадзіць і казаць, што ў нас каровы кульгаюць, страўнік у іх не такі, сэрца баліць... Чаму? Таму што мы структуру кармоў парушылі, не рыхтуем корм так, як трэба для жывёлы. Кормім сіласам — гэтай кіслатой. Напэўна, нашы продкі былі не дурні, калі нарыхтоўвалі дастатковую колькасць сена, каб накарміць карову і цяля паставіць на ногі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў Мінсельгасхарчы распрацавана структура, якой неабходна строга прытрымлівацца. «У гэтым годзе — пераходны перыяд, блізкі да таго, што вы спланавалі. А ў будучым годзе — жалезабетонна мы павінны дзейнічаць па зададзенай структуры кармоў. І хопіць практыкавацца! За гэта ў крымінальным парадку будуць несці адказнасць ад кіраўнікоў, спецыялістаў да прэм'ер-міністра», — сказаў Прэзідэнт. «Мы не можам больш, укладваючы велізарныя грошы, дараваць безгаспадарчасць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы ў чарговы раз звярнуў увагу на тое, што павінна быць забяспечана абарона раслін і праведзена неабходная падрыхтоўка да ўборкі збожжа. «Нічога новага, але жалезная дысцыпліна», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Закрануў Аляксандр Лукашэнка і праблему з мясам свініны, запатрабаваўшы ад урада яе вырашыць. Прэзідэнт падкрэсліў, што для гэтага да зімовага перыяду ўсе свінакомплексы павінны быць напоўнены. «Што за праблема? Гэта ж не быка вырасціць, што яму трэба 18 месяцаў! Гэта на працягу года можна аднавіць пагалоўе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў віцэ-прэм'ера Міхаіла Русага і міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца, як вырашаецца гэтая праблема. Міхаіл Русы далажыў, што сёння ў гаспадарках 330 тысяч свінаматак і ставіцца задача да 1 студзеня вырашыць усе пытанні. Аднак Прэзідэнт застаўся незадаволены тым, якімі тэмпамі запаўняюцца свінакомплексы. «Вы мне казкі не распавядайце! — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму што вы не ходзіце на рынкі і не бачыце, як сёння ў цане вырасла свініна. І, парэзаўшы свіней, вы не падумалі пра тое, каб зрабіць дэзынфекцыю, адрамантаваць памяшканні і змясціць туды жывёлу». «Таму пагалоўе павінна быць адноўлена, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І неабходна не толькі аднавіць, але і перасягнуць ранейшы ўзровень сельскай гаспадаркі. Вось і ўвесь наш ВУП».

Закранаючы тэму нарыхтоўкі кармоў, Леанід Заяц адзначыў, што ёсць праблемы з іх якасцю. Гэта адбіваецца на вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Паводле яго слоў, ёсць страты ў аб'ёмах у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам за чатыры месяцы. Так, ёсць недабор каля 28,6 тысячы тон па малацэ і каля 30 тысяч тон па мясе. Як адзначыў міністр, на наяўнай базе кармоў з такой якасцю атрымаць вялікую аддачу немагчыма. Паводле яго слоў, страчана прадуктыўнае пагалоўе буйной рагатай жывёлы, знізіліся сярэднясутачныя прывагі. Што тычыцца сітуацыі ў малочнай галіне, то тут найбольш складаная сітуацыя ў Віцебскай вобласці. У той жа час міністр абяцае, што да канца года сітуацыя выправіцца.

## Незабыўныя кветкі «Вясновага букета»



Слуцкія ручнікі рассцілае метадыст Слуцкага раённага цэнтра народнай творчасці Таццяна Дабрынеўская.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Вясновы букет» — суквецце талентаў і залатых рук, сапраўднае ўпрыгажэнне сталічнага Лошыцкага парку, у якім штогод напрыканцы мая (сёлета ў мінулыя выхадныя) сустракаюцца лепшыя з лепшых, самыя майстравітыя і самабытныя з народных майстроў — вышывальшчыцы і ткачыхі, разьбяры і керамісты, салома- і лозапляцельшчыкі, кавалі і бондары — самыя розныя ўмельцы, якія імкнуцца зберагчы, дбайна развіваюць і папулярызуюць традыцыйнае народнае мастацтва і промыслы.**

СТАР. 3

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАЛІНІН, старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў:**

***«Указ № 222 «Аб рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці і рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі» дазваляе ІП мець трох наёмных работнікаў не з ліку блізкіх сваякоў, а таксама адмяняе абмежаванне па колькасці гандлёвых, абслуговых і іншых аб'ектаў, якія выкарыстоўваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў сваёй дзейнасці. Гэта прагрэсіўныя нормы, якія дазволяць развіваць прадпрымальніцтва не толькі ў гандлі, але і ў сферы паслуг, вытворчасці. Напрыклад, калі сваякі не мелі патрэбнай кваліфікацыі або інжынернай падрыхтоўкі для аказання сэрвісных паслуг, гэта моцна стрымлівала развіццё менавіта вытворчага сектара сярод ІП і прымушала развівацца толькі сферу гандлю».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10070,00 | ▲ |
| Еўра | 13750,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 294,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 846,22 | ▲ |

■ Камунальныя стасункі

## НЕ ЖЭСАЎСКІ КЛОПАТ

### адказваць за парадак у дварах мусяць жыльцы

**Укладанне ўласных сродкаў стымулюе людзей падтрымліваць чысціню і ўтульнасць сваіх двароў і пад'ездаў. Сапраўды, калі вы змайстравалі лаву альбо заплацілі грошы за ўсталяванне дзіцячай горкі ў двары свайго дома, наўрад ці станеце гэтую лаву ці горку ламаць. Ды яшчэ пачняце пільна сачыць, каб ніякі залётны вандал прадметы вашых фізічных і фінансавых укладанняў не сапсаваў.**

### За што плацім?

— Летась толькі на замену і ўстаноўку дзіцячага абсталявання ў дварах, дзе за парадкам сочаць жыллёвыя службы, пайшло больш за мільярд рублёў сродкаў насельніцтва. Агульная ж сума грошай жыльцоў, выдаткаваных на добраўпарадкаванне двароў і пад'ездаў у 2013 годзе, склала больш за 20 млрд рублёў — гэта амаль траціна ўсіх выдаткаў, — распавяла «Звяздзе» **галоўны спецыяліст аддзела добраўпарадкавання Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Зінаіда СТАВЕР.**

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сёння — Дзень пагранічніка

## ДЗЯРЖАЎНАЯ МЯЖА: КАМФОРТ СЯБРУЕ З БЯСПЕКАЙ

Неўзабаве з'явіцца электронная сістэма браніравання месца ў чарзе на беларускай мяжы

**Напярэдадні прафесійнага свята адбылася сустрэча старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі генерал-палкоўніка Леаніда МАЛЬЦАВА з журналістамі. Кіраўнік Дзяржпагранкамітэта адзначыў высокі ўзровень працы пагранічнай службы падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі, расказаў пра надзённыя задачы сілавой структуры, абазначыў асноўныя кірункі міжнароднага супрацоўніцтва.**

— Мінулы перыяд для пагранічнай службы быў цяжкі і напружаны, як з пункту гледжання сённяшняй сітуацыі, так і з улікам аб'ёму мерапрыемстваў, — зазначыў Леанід Мальцаў. — Беларускія пагранічнікі зрабілі ўсё па максімуме ў інтарэсах самага высокага ўзроўню падрыхтоўкі і правядзення чэмпіянату свету па хакеі. Наша дзяржава пайшла на беспрэцэдэнтныя крокі ў бок гасціннасці, прыняўшы рашэнне па адмене віз на час чэмпіянату для яго ўдзельнікаў і гасцей. Такога вопыту яшчэ не мела ні адна краіна ў свеце. Нам давялося вырашыць шмат пытанняў, каб сумясціць, здавалася б, такія супрацьлеглыя рэчы, як камфорт і бяспеку на мяжы, але гэта ў нас атрымалася.

Усяго па бязвізавай форме ў Беларусь прыехала больш чым 31 тыс. замежных балельшчыкаў і ўдзельнікаў спаборніцтва. У асобныя дні ў нашу краіну на ахоўным участку мяжы ўязджала да 5 тыс. балельшчыкаў у дзень. Больш за 10,3 тыс. чалавек прыехала на чэмпіянат з Латвіі, 4,3 тыс. — з Літвы, больш чым 2 тыс. — з Фінляндыі. Вялікая колькасць балельшчыкаў трапіла да нас і цераз расійскую мяжу, дзе пагранічнікі кантроль не ажыццяўляюць.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НА МАЛАЗІЙСКІМ «БОІНГУ» МАГЛО ЗАКОНЧЫЦЦА ПАЛІВА

На самалёце Boeing 777-200 «Малайзійскіх авіяліній», які знік 8 сакавіка гэтага года, хутчэй за ўсё, скончылася паліва, пасля чаго ён упаў у Індыйскі акіян. Пра гэта паведамілі спецыялісты агенцтва транспартнай бяспекі Аўстраліі па выніках аналізу спадарожнікавай інфармацыі, якая была апублікавана малайзійскімі ўладамі ў спецыяльным дакладзе.

Паводле гэтых даных, гукавыя сігналы з самалёта, якія паступалі на спадарожнік кожную гадзіну, сталі прыходзіць нерэгулярна перад тым, як сувязь з паветраным суднам была канчаткова страчана. Гэта дазваляе выказаць здагадку, што ў электроннай сістэме «Боінга» некалькі разоў адбываліся збоі з-за недахопу паліва, сцвярджаюць эксперты. Boeing 777-200, які выконваў рэйс да Пекіна, вылецеў з Куала-Лумпура ў 02.40 па мясцовым часе 8 сакавіка 2014 года і праз дзве гадзіны пасля гэтага знік з экранаў авіядыспетчараў.

### ПАРАШЭНКА ПААБЯЦАЎ ПРАДАЦЬ СВОЙ ШАКАЛАДНЫ БІЗНЕС «РАШЭН»



Абраны прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка пацвердзіў, што зробіць рашучы крок пасля таго, як зойме пасаду кіраўніка дзяржавы, — прадасць свой бізнес і сканцэнтруе ўсе намаганні на працы. Не будзе прададзены толькі «Пяты канал».

Парашэнка быў самым багатым кандыдатам у прэзідэнты Украіны. Часопіс Forbes ацаніў багацце абранага прэзідэнта Украіны па выніках 2013 года ў 1,3 млрд долараў. Галоўнай сферай інтарэсаў бізнесмена часопіс назваў харчовую прамысловасць. Як піша РБК, «найбольшую вагу» ў багацці Парашэнкі маюць два прадпрыемствы — кандытарская карпарацыя Roshen і група «Агрападінвест», якой належыць больш за 100 тыс. га зямлі ва Украіне. Таксама ў лік актываў Парашэнкі ўваходзяць харчовая кампанія «Падолле», Днепрапятроўскі крухмала-патачны камбінат, машынабудаўнічы холдынг «Ленінская кузня», тэлеканал «Пяты канал» і элітны фітнес-клуб у Кіеве «5 элемент». Але галоўны актыў Парашэнкі — гэта «Рашэн», вялізная кампанія з вялікім аб'ёмам экспарту. Агульны аб'ём вытворчасці складае 450 тысяч тон кандытарскіх вырабаў у год. Група выпускае 320 найменняў кандытарскай прадукцыі — цукерак, тартоў, вафель і інш. Для параўнання, 19 фабрык расійскага холдынга «Аб'яднаныя кандытары» вырабілі ў 2013 годзе толькі 350 тысяч тон прадукцыі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАПА ФРАНЦЫСК НЕ ВЫКЛЮЧАЕ МАГЧЫМАСЦІ ПАЙСЦІ НА ПЕНСІЮ



Пантыфік сказаў, што можа паўтарыць учынак свайго папярэдніка Бенедыкта XVI і пайсці на пенсію, перадаюць інфармагенцтвы.

«Я зраблю так, як загадае мне Гасподзь», — таксама сказаў пантыфік, адказваючы на пытанні журналістаў з нагоды таго, ці можа ён пайсці на спачынак, калі пагоршыцца яго здароўе. Акрамя таго, ён адзначыў, што сенсацыйнае рашэнне папярэдняга Папы Рымскага аб сыходзе на пенсію можа стаць пачаткам стварэння інстытуту «ганаровага Папы ў адстаўцы». Пры гэтым папа Францыск падкрэсліў: «Ці будуць папы часцей сыходзіць на спачынак — невядома, але дзверы адчынены». Папа Францыск (Хорхе Марыа Бергольа) быў абраны на свой пост 13 сакавіка 2013 года і стаў першым пантыфікам-езуітам. Дагэтуль ён быў аргенцінскім кардыналам — архіепіскапам Буэнас-Айрэса. У сваю чаргу, яго папярэднік Бенедыкт XVI, быў першым за апошнія 60 гадоў Папам Рымскім, які пайшоў на спачынак.

КОРАТКА

Правам бязвізавага ўезду ў краіну ў час чэмпіянату свету па хакеі-2014 скарысталіся больш за 31 тыс. замежных балельшчыкаў і ўдзельнікаў першынства.

У Беларусі ў красавіку 2015 года пройдзе чэмпіянат свету па футзале. Ужо вызначана, што турнір прыме Мінск, а таксама Брэст.

Фестываль традыцыйнай культуры «Зялёныя святкі», прысвечаны святу Сёмухі, пройдзе 1 чэрвеня ў Магілёўскім этнаграфічным комплексе народных промыслаў у Зялёным гаі.

У Мінску 31 мая і 12 чэрвеня з 0.00 па 24.00 будзе абмежаваны продаж алкагольных напіткаў, піва і слабаалкагольных напіткаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш як 7%, за выключэннем рознічнага гандлю ў аб'ектах грамадскага харчавання на разліў.

Былы галоўны трэнер нацыянальнай каманды Беларусі па хакеі Глен Хэнлан узначаліць зборную Швейцарыі. Чуткі аб гэтым распаўсюджваліся ў СМІ і інтэрнэце яшчэ ў час чэмпіянату.

■ Добрая навіна

## БЭБІ-БУМ У БАБРУЙСКУ

Яго чакаюць пасля адкрыцця новага корпуса радзільнага дома

**Урачыстае адкрыццё корпуса адбылося некалькі тыдняў таму. Наколькі важная гэта для вобласці падзея, можна меркаваць па прысутных, сярод якіх былі міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК.**

Цяпер агульная плошча радзільні павялічылася амаль у 2,5 раза. Аперацыйныя аснасцілі сучаснай наркозна-дыхальнай апаратурай і дэфібрылятарамі. Лапараскапічная стойка нямецкай фірмы Karl Storz, якая з'явілася на ўзбраенні бабруйскіх медыкаў, дазволіць праводзіць менш траўматычныя аперацыі. Аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі для неданошаных нованароджаных абсталявана інкубатарамі высокага класа і сістэмамі маніторавання фірмы «Драгер» з вывадам інфармацыі на пост медыцынскай сястры і ў ардынатарскую. Такія ж інкубатары і відэасістэма ёсць і ў аддзяленні рэанімацыі для дарослых.

Інфармацыйныя тэхналогіі дайшлі і да прыёмнага аддзялення. Тут усталявана зручная АІС, якая дазваляе адмовіцца ад ранейшых, папяровых, формаў уліку і перайсці на прынцыпова новы, электронны метад вядзення медыцынскай дакументацыі. На кожную пацыентку тут будзе назапашвацца інфармацыя і апаратыўна, па першым запатрабаванні, перадавацца ў аддзяленні.

Перажыў другое нараджэнне і харчблок, які прывялі ў адпаведнасць з усімі санітарна-гігіенічнымі патрабаваннямі.

СТАР. 3



Фота Аляксандра АНТАШКЕВІЧА.

# ДЗЯРЖАЎНАЯ МЯЖА: КАМФОРТ СЯБРУЕ З БЯСПЕКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як расказаў кіраўнік ведамства, увогуле рызыкі і пагрозы з захаду і поўначы звязаны з патокам наркатрафіку і кантрабанды, якая актыўна расце, з усходу — з незаконнай транзітнай міграцыяй і таксама наркатрафікам, з поўдня — з кантрабандай. З кожным годам павялічваюцца транспартныя пасажырскія патокі. Выключэнне ў гэтым сезоне складае ўкраінскі напрамак. Па якіх прычынах — зразумела.

Па словах Леаніда Мальцава, першапачатковыя задачы пагранічнай службы звязаны з развіццём пагранічнай інфраструктуры і тэхнічнага аснашчэння. «Пункты пропуску павінны быць накіраваны на павышэнне камфорту і прапускной здольнасці, — падкрэсліў генерал-палкоўнік. — Натуральна, што мы ставім сабе мэты, каб дзяржаўная мяжа была камфортнай для перасячэння не толькі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, але і ўсімі, хто едзе да нас. З іншага боку, мы абавязаны наладзіць бяспеку краіны: спыніць нелегальнае перасячэнне мяжы, распаўсюджванне цераз яе наркотыкаў і кантрабанды. Мэты падобных мерапрыемстваў — выключыць працяглыя чэргі на дзяржаўнай мяжы. Чэргі грузавікоў — у першую чаргу, эканамічныя страты пры транзіце, а для грамадзян — каласальныя страты ў часе».

Адзін з выхадаў, які бачаць у Дзяржпагранкамітэце, заключаецца ў стварэнні сістэмы электроннага браніравання чэргаў. «Зразумела, пытанне не з простых і не з танных, — прызнаўся старшыня. — Але калі яго не вырашаць, то, адпаведна, чэргі будуць толькі павялічвацца і праблемы застануцца. Мы сёння прымаем усе меры для таго, каб у 2015 годзе сістэма ўжо запрацавала. У прыватнасці, у пункце пропуску Казловічы, які стане нашым пілотным праектам, і Каменным Логу. Каб электронныя чэргі працавалі як трэба, на месцах будуць арганізаваны сэрвісныя зоны».

У інтарэсах пагранічнай бяспекі Дзяржпагранкамітэт сёння актыўна працуе і па лініі міжнароднага супрацоўніцтва. У гэтым годзе на беларускай мяжы рэалізоўваюцца 8 праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі, агульны бюджэт якіх складае больш чым 2,6 млн долараў. Для параўнання, летась такіх праектаў было 5. Праведзены сустрэчы з кіраўнікамі сумежных пагранічных службаў. Гэта было звязана не толькі з задачамі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі, а і па перспектыўных пытаннях супрацьдзеяння трансмежавай злачыннасці, незаконнай міграцыі, наркатрафіку, ядзернай бяспекі, а таксама забеспячэння бесперапыннага функцыянавання пунктаў пропуску.

**Мы сёння прымаем усе меры для таго, каб у 2015 годзе сістэма ўжо запрацавала. У праватнасці, у пункце пропуску Казловічы, які стане нашым пілотным праектам, і Каменным Логу.**

Сёння актыўна рэалізуецца саюзная праграма ўмацавання пагранічнай бяспекі на перыяд 2012— 2016 гг. Бюджэт Дзяржпагранкамітэта Беларусі ў праграме складае 1 млрд расійскіх рублёў. Засвоена ўжо трэць бюджэту. У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў адпаведнай праграмы межы абсталёўваюцца тэхнікай, абсталяваннем і тэхнічнымі сродкамі аховы, арганізавана падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі беларускіх пагранічнікаў у адукацыйных установах вышэйшай прафесійнай адукацыі ФСБ Расіі. Актыўна ідзе працэс мадэрнізацыі і пераaснашчэння аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю, выкананы праектныя і разведвальныя работы, праведзена экспертыза і аплата праектна-каштарыснай дакументацыі на мадэрнізацыю і пераaснашчэнне комплексаў сродкаў аўтаматызацыі на 38 пунктах пропуску, завершаны работы па мадэрнізацыі і пераaснашчэнні на 15 пунктах. Яшчэ 23 аб'екты аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю будуць мадэрнізаваны да канца гэтага года.

— Дзяржпагранкамітэт шмат надае ўвагі і інфармацыйным аспектам, — падкрэсліў Леанід Мальцаў. — Шмат было зроблена для таго, каб карысная інфармацыя аб спрыяльных умовах наведвання чэмпіянату дайшла да спажыўца. Я маю на ўвазе новы інфармацыйны партал са спецыяльным раздзелам на рускай і англійскай мовах, сацыяльную відэарэкламу ў інтэрнэце і на тэлебачанні. Партал не перастане існаваць: ён стане ў тым ліку элементам аказання шматлікіх паслуг, звязаных і з электронным браніраваннем.

Напрыканцы старшыня Дзяржпагранкамітэта выказаў удзячнасць нашым суседзям, якія поўнасцю выканалі свае функцыі па ўзаемадзеянні ў межах чэмпіянату і актыўна дапамагалі як у пытаннях законнага перасячэння дзяржаўнай мяжы, так і ў пытаннях бяспекі. Безумоўна, у тым, што чэмпіянат удаўся і стаў «рэкардсменам» па наведвальнасці ў гісторыі сусветнага хакея, ёсць і заслуга пагранічнікаў. Са святам!

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота БЕЛТА.

**Водныя рубяжы Рэспублікі Беларусь з сумежнай дзяржавай Украіна, якія праходзяць па рацэ Днепр, складаюць амаль 200 км. Штосутачны кантроль і ахову дзяржаўнай мяжы на Дняпры ў Лоеўскім і Брагінскім раёнах Гомельскай вобласці ажыццяўляюць рачныя пагранічнікі Лоеўскага атрада берагавой аховы Гомельскага пагранічнага атрада. На ўзбраенні пагранічнікаў сёння знаходзяцца быстраходныя (развіваюць хуткасць да 80 км/гадзіну) і практычна бясшумныя катары айчыннай і італьянскай вытворчасці, якія забяспечаны сучаснай навігацыйнай сістэмай і абсталяваннем начнога бачання.**

**На здымку: намеснік начальніка Лоеўскага атрада берагавой аховы Максім Мельнік падчас праверкі дакументаў у рыбакоў на беразе Дняпра.**

***Камандаванню, асабоваму складу, ветэранам органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь***

Паважаныя таварышы!

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём пагранічніка!

Рубяжы нашай Радзімы з'яўляюцца тым свяшчэнным месцам, дзе праяўляецца трываласць нашай суверэннай дзяржавы, рэальная здольнасць забяспечыць яе абарону і тэрытарыяльную цэласнасць.

Ратная слава воінаў у зялёных фуражках стваралася на ўсіх этапах гісторыі нашай краіны. Навекі застануцца ў памяці мужнасць і гераізм, праяўленыя пагранічнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 70-годдзе якога адзначаецца ў гэтым годзе.

Упэўнены, што сваім прафесіяналізмам, імкненнем самаадданa служыць беларускаму народу органы пагранічнай службы і ў далейшым будуць надзейна забяспечваць непарушнасць нашых граніц.

Асаблівыя словы ўдзячнасці і пажаданні даўгалецця ветэранам-пагранічнікам, якія прысвяцілі лепшыя гады жыцця ахове і абароне рубяжоў Айчыны.

Жадаю вам поспехаў у службе, моцнага здароўя і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

■ Напярэдадні падзеі

## ДА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ ПРАЗ НАЙНОЎШЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

**Асноўная ўвага на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД, якое пройдзе ў Мінску 30 мая, будзе ўдзелена пытанням эканамічнага супрацоўніцтва. Аб гэтым паведаміў учора журналістам старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У прыватнасці, будзе абмеркавана такое важнае пытанне, як рэалізацыя Міждзяржаўнай праграмы інавацыйнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці на перыяд да 2020 года. «Гэта праграма працуе, праекты ўжо вызначаны — гэта 11 праектаў з краін СНД, якія ўдзельнічаюць у гэтай праграме, — адзначыў Сяргей Лебедзеў. — І Выканаўчы камітэт СНД, і галіновыя саветы робяць усё для таго, каб праграма атрымала далейшую рэалізацыю».

Акрамя таго, будуць разгледжаны гуманітарныя пытанні. У прыватнасці, некалькі гуманітарных устаноў будуць вызначаны як базавыя арганізацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў краін Садружнасці.

Як адзначыў старшыня Выканаўчага камітэта, мяркуючы па тым, як ідзе падрыхтоўка, якіх-небудзь праблем у час абмеркавання і прыняцця рашэнняў на маючым адбыцца пасяджэнні савета кіраўнікоў урадаў не прадбачыцца: усе пытанні дасканала падрыхтаваны.

На пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў будуць разгледжаны 23 праекты дакументаў. На парадку дня пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы міждзяржаўнага абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй. Праект гэтага дакумента распрацаваны для пашырэння такога абмену, развіцця інфармацыйнай і інавацыйнай прасторы СНД, а таксама сумеснага і ўзаемавыгаднага выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў. Удзельнікі пагаднення возьмуць на сябе абавязацельства садзейнічаць стварэнню і прымяненню скораснага доступу да інфармацыйных рэсурсаў праз найноўшыя тэхналогіі.

На парадку дня будуць таксама пытанні, звязаныя з інфармацыйным узаемадзеяннем у галіне транспартнай бяспекі, міждзяржаўнай радыёнавігацыйнай праграмы СНД, развіццём супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, сумеснымі мерамі прафілактыкі і барацьбы з яшчурам.

Савет кіраўнікоў урадаў разгледзіць пытанні фінансава-гаспадарчай дзейнасці органаў Садружнасці

■

■ На кантролі

## МОДА НА АГРАТУРЫЗМ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЗЛОЎЖЫВАННЯЎ

**На Віцебшчыне за мінулыя пяць гадоў у 5 разоў павялічылася колькасць тых, хто займаецца аграэкатурызмам. Летась у сядзібах адпачылі больш за 30 тысяч чалавек, што прыкладна на трэць больш, чым у пазамінулым годзе. Амаль 85% турыстаў — нашы суграмадзяне, 13,7% — расіяне, астатнія — з іншых краін свету. Пры гэтым уладальнікі сядзіб пераважна працуюць з турыстамі напрамую. Ці выгадны такі бізнес? Ці ёсць яшчэ праблемы, тыповыя для ўсёй краіны?**

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці правялі тэматычны маніторынг.

Як канстатуюць рэвізоры, сумяшчаць вытворчую дзейнасць і паслугі ў сферы аграэкатурызму атрымліваецца не ва ўсіх. Спецыялісты гэта тлумачаць і неаднолькавымі ўмовамі пры атрыманні крэдытнай падтрымкі. Вядомы «інвестар» аграрнага турызму краіны Белаграпрамбанк можа крэдытаваць грамадзян, якія яшчэ не пачалі аказваць паслугі ў сферы аграэкатурызму, а толькі плануюць займацца турыстычным бізнесам. Пры гэтым для крэдытавання сельскагаспадарчых арганізацый устаноўлены больш жорсткія ўмовы: неабходна ажыццяўляць дзейнасць не менш за год і атрымаць выручку...

— У цэлым дзяржаўная падтрымка ў сферы аграэкатурызму спрыяла распаўсюджванню такога віду дзейнасці. Аднак Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ад 02.06.2006 № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь») , нават з улікам пяці змен, не прадугледжвае зняцця шэрагу пытанняў і праблем, якія ўзнікаюць.

Асноўная праблема — размяжаванне паслуг у сферы аграэкатурызму і прадпрымальніцкай дзейнасці. На практыцы дзейнасць па здачы ў наём жылля і прадастаўленне жылля ў аграсядзібе маюць адрозненні толькі ў падатковай нагрузцы. Напрыклад, пры здачы ў наём жылога памяшкання, размешчанага ў гарадах раённага падпарадкавання і пасёлках гарадскога тыпу, грамадзянін абавязаны штомесяц выплачваць падаходны падатак у фіксаванай суме (за кожны пакой) — 70 тысяч рублёў, на вёсцы — 50 тысяч. А вось суб'ект аграэкатурызму, які валодае домам з дзесяццю пакоямі, павінен выплачваць за год толькі базавую велічыню. (Але ў выпадку здачы гэтых пакояў уначэм за год неабходна выплаціць падаткаў ад 6 мільёнаў рублёў у малых населеных пунктах і сельскіх тэрыторыях да 8,4 мільёна — у гарадах і пасёлках, каментуюць нюансы спецыялісты вышэйзгаданага камітэта.)

Падчас маніторынгу былі выяўлены дзве фермерскія гаспадаркі, дзейнасць якіх не адпавядае крытэрыям, вызначаным указам для сельскагаспадарчых арганізацый, якія маюць права ажыццяўляць дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму.

Было выяўлена, што вырошчванне і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі не толькі не з'яўлялася асноўным відам дзейнасці гаспадаркі, але і зусім не ажыццяўлялася. Яны зараблялі толькі на прыёме прыезджых, але выплачвалі сімвалічны падатак — базавую велічыню. Такім чынам за апошнія два гады адна гаспадарка атрымала даход у памеры 53 мільёны рублёў, другая — 531 мільён. Варта адзначыць, што пры ўжыванні гаспадаркамі спрошчанай сістэмы падаткаабкладання ў бюджэт магло б паступіць каля 30 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Меркаванне

# УКРАІНА ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ



**Такім чынам, па выніках пазачарговых прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне, што прайшлі 25 мая, ужо ў першым туры вызначыўся пераможца — Пётр Парашэнка. Пры гэтым вялікай інтрыгі ад выбараў ніхто не чакаў — было ясна, што Парашэнка з'яўляецца самым папулярным кандыдатам. Больш было абмеркаванняў, выйграе ён у першым туры або спатрэбіцца таксама і другі. Але Парашэнка справіўся ўжо ў першым туры больш чым з 54 працэнтамі галасоў. Пры гэтым ён змог у чатыры разы адарвацца ад бліжэйшага канкурэнта — Юліі Цімашэнкі. Чым можна растлумачыць такі сур'ёзны адрыў?**



Верагодна, на гэта паўплывала шмат фактараў. На фоне пастаянных дыскусій аб татальнай карупцыі ранейшай палітычнай эліты яна аказалася занадта вялікім старажылам ва ўкраінскай палітыцы, што сыграла супраць яе. Яна двойчы была прэм'ер-міністрам, у тым ліку ў разгар сусветнага фінансавага крызісу, калі Украіне і яе грамадзянам прыйшлося не соладка. Мае значэнне і знакаміты газавы кантракт, Цімашэнка заключыла з Расіяй па цане, якая ў апошнія гады ва ўнутраных дыскусіях аб'яўляецца занадта завышанай. Не змагла Цімашэнка ўтрымацца і ад мноства радыкальных заяў, якія значна звузілі кола яе электарату. Немалаважным фактарам з'яўляецца і пройгрыш Цімашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года Віктару Януковічу.

Такім чынам, ва Украіне зноў ёсць прэзідэнт, акрамя Віктара Януковіча, які знаходзіцца ў Расіі і ўжо практычна не ўплывае на ўнутраныя ўкраінскія справы. Беларускі МЗС вітаў украінскія выбары, выказаўшы надзею, што яны стануць «значным крокам на шляху да аднаўлення ўзаемаразумення, нармалізацыі сітуацыі ў краіне, пабудовы ва Украіне паўнавартаснай вертыкалі ўлады». І нам сапраўды хацелася б гэтага. Але што рэальна змянілася ў краіне пасля гэтых выбараў?

На самой справе падстаў для аптымізму не шмат. Заходнія ўрады і да гэтага цалкам прызнавалі ўладу, якая сфарміравалася пасля лютаўскага перавароту. Што ўжо тут казаць, калі ёй былі вылучаны немалыя крэдыты без усялякіх палітычных умоў. А праблемы і пасля выбараў засталіся ранейшыя. У краіне працягвае разрастацца сур'ёзны эканамічны крызіс. Усё большы ціск ён аказвае на сацыяльныя абавязацельствы бюджэту перад грамадзянамі, што нязменна будзе выклікаць рост незадаволенасці, хоць пры наяўнасці новага прэзідэнта, хоць без яго.

Тут могуць быць два варыянты развіцця падзей. У адпаведнасці з тым, што падтрымліваецца Захадам, Пётр Парашэнка павінен будзе прымаць і падтрымліваць непапулярныя меры па татальнай эканоміі на грамадзянах краіны. Меры гэтыя могуць аказацца неэфектыўнымі ў плане аднаўлення эканомікі. Такое паказаў вопыт Грэцыі, якая зацягнула паясы і адправілася пасля ў зацяжное падзенне на чатыры гады.

Другі варыянт выратавання эканомікі заключаецца ў прыцягненні новых інвестыцый і павелічэнні экспарту. Але ён немагчымы ва ўмовах практычна ўжо распачатай грамадзянскай вайны. Паўднёвы ўсход краіны па-ранейшаму ахоплены рэвалюцыйным полымем, і новыя ахвяры ў сутыкненнях з урадавымі войскамі выклікаюць толькі рост жорсткасці сярод паўстанцаў, умацоўваючы іх гатоўнасць змагацца далей.

І першыя заявы Пятра Парашэнкі адразу пасля выбараў не выклікаюць надзеі на спыненне сутыкненняў з дапамогай мірных перамоў Кіева з паўстанцамі. Паводле яго слоў, сілавая аперацыя на паўднёвым усходзе павінна быць працягнута. Некаторую надзею выклікае толькі гатоўнасць Парашэнкі да асабістай сустрэчы з Пуціным у ліпені. Праўда, яна можа прайсці досыць складана ці зусім не адбыцца, улічваючы тое, што новы прэзідэнт ужо заявіў, што «адным з прыярытэтаў дзейнасці прэзідэнта і ўсёй украінскай улады будзе вырашэнне крымскага пытання, вяртанне Крыма Украіне, абарона ўкраінцаў, якія цяпер жывуць у Крыме».

**Першыя заявы Пятра Парашэнкі адразу пасля выбараў не выклікаюць надзеі на спыненне сутыкненняў з дапамогай мірных перамоў Кіева з паўстанцамі.**

Расійскі бок паспеў адрэагаваць на гэта выказванне. Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў адзначыў, што «Крым — рэгіён Расійскай Федэрацыі, таму гаворкі пра ўваходжанне яго ў склад Украіны не ідзе».

З упэўненасцю можна прадбачыць і тое, што Парашэнка сутыкнецца са шматлікімі праблемамі з боку розных палітычных сіл унутры краіны. Так, прадстаўнік фракцыі «Батьківщина» Сяргей Уласенка ўжо заявіў пра намер ініцыяваць 15 чэрвеня рэферэндум па пытанні ўваходжання краіны ў НАТА. А гэта не той фон, які зможа зрабіць перамовы Парашэнкі з Пуціным паспяховымі. Разумеючы гэта, сам Парашэнка ўжо выказваўся раней пра нежаданне ставіць пад пагрозу краіну, ініцыіруючы ўваходжанне Украіны ў НАТА.

Не варта забываць і пра Еўрамайдан, які шмат у чым быў «выгадаваны» самім Парашэнкам, але ўжо стаў самастойнай сілай, здольнай учыніць чарговыя беспарадкі, калі лідары вырашаць, што «заваёвы рэвалюцыі» пад пагрозай.

Такім чынам, прэзідэнцкія выбары ва Украіне адбыліся, але чакаць, што гэта дазволіць хутка вырашыць назапашаныя праблемы, не даводзіцца. Для іх няма простых рашэнняў, а большасць галасоў, атрыманых на выбарах, не стане надзейнай асновай для прыняцця Парашэнкам правільных рашэнняў.

Гэтаму перашкодзіць і вяртанне ў лютым 2014 года да варыянту Канстытуцыі, у якой паўнамоцтвы прэзідэнта істотна скарочаны. А як паказвае папярэдняя практыка прыняцця рашэнняў ва Украіне, у сітуацыі разладу і пастаянных канфліктаў паміж галоўнымі палітычнымі сіламі, нават правільныя палітычныя крокі абвяшчаюцца канкурыруючымі групоўкамі небяспечнымі для Украіны і тарпедуюцца.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЭВІЗОРЫ ПРАВЕРЫЛІ КАМУНАЛЬНІКАЎ

**Супрацоўнікі Віцебскага абласнога камітэта дзяржаўнага кантролю высветлілі, што электраэнергія для падачы вады ў дамы і кватэры расходуецца нерацыянальна.**

— У Гарадоцкім раёне было выяўлена, што ў цэлым расход электраэнергіі па прадпрыемстве, якое адказвае за «камуналку», не перавышаны. Пры гэтым на некаторых артэзіянскіх свідравінах значна эканомяць электраэнергію для падачы вады, а на іншых — перарасход ў 3,5 раза, — расказвае карэспандэнту «Звязды» **Святлана Панкратава, намеснік начальніка ўпраўлення кантролю галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы камітэта.**

А на аналагічным прадпрыемстве ў Віцебскім раёне ў разлік расходу электраэнергіі ўключалася эксплуатацыя абсталявання артэзіянскіх свідравін, якія не пампуюць ваду. У выніку на сабекошт паслугі па водазабеспячэнні ў 2012 годзе неабгрунтавана спісалі больш за 520 мільёнаў рублёў, а летась — больш за 300 мільёнаў рублёў.

Рэвізоры выявілі і факты нерацыянальнага выкарыстоўвання дроў. Падчас маніторынгу высветлілася, што на прадпрыемствах сістэмы ЖКГ часта выкарыстоўваюць драўніну павышанай вільготнасці. У выніку — перарасход паліва прыводзіць да падаражання цеплавой энергіі.

У камітэце прапанавалі канкрэтныя парады: што трэба зрабіць для памяншэння сабекошту жыллёва-камунальных паслуг, каб завышаныя выдаткі камунальнікаў не білі па кішэнях грамадзян і мясцовых бюджэтаў. З апошніх аплачваецца 75% выдаткаў на аплату паслуг ЖКГ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## БЕСПРАЦОЎЕ — 0,5%

**У студзені—красавіку ў эканоміцы было занята 4 481,7 тысячы чалавек, што на 1,4% менш, чым у адпаведны перыяд летась.**

Паводле інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на пачатак мая склала 22,5 тысячы чалавек, што на 12,7% менш, чым у маі 2013-га. Спецыялістамі падлічана, што ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя за год паменшыўся і склаў 0,5% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Арганізацыямі (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у красавіку было прынята на працу 58,9 тысячы чалавек. Звольнена па розных прычынах 76,2 тысячы чалавек, з іх 5,4% было звольнена за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 0,6% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў і ліквідацыяй арганізацый.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЁСЦЬ БІЛЕТЫ Ў КРЫМ

**Па ўзгадненні з датычнымі чыгуначнымі адміністрацыямі Беларуская чыгунка адкрыла продаж білетаў на цягнікі ў зносінах з Крымам на пачатак летняга перыяду.**

Гаворка ідзе пра цягнікі №100/99 Мінск — Сімферопаль (адпраўленне штодзённа з 1 па 15 чэрвеня) і №393/394 Полацк — Сімферопаль (адпраўленне з 2 па 14 чэрвеня па днях курсіравання).

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, па новым графіку цягнік №100/99 Мінск — Сімферопаль будзе адпраўляцца штодзённа са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 7.45 і прыбываць на станцыю Сімферопаль-Пасажырскі на наступны дзень у 13.05. Час адпраўлення цягніка ў зваротным кірунку з Сімферопаля — 19.20, у Мінску ён будзе ў 23.17 наступнага дня.

Цягнік №393/394 Полацк — Сімферопаль будзе адпраўляцца з 2 чэрвеня раз на чатыры дні са станцыі Полацк у 16.58 і прыбываць на станцыю Сімферопаль-Пасажырскі на наступны дзень у 8.42. У зваротным накірунку цягнік будзе выходзіць з Сімферопаля ў 11.45 і прыбываць у Полацк у 23.47 наступнага дня.

Чыгуначнікі нагадваюць пасажырам: уважліва сачыце за абнаўленнем інфармацыі, якая датычыць змен умоў продажу праязных дакументаў на цягнікі на афіцыйным інтэрнэт-сайце Беларускай чыгункі, а таксама на інфармацыйных стэндах і ў касах чыгуначных вакзалаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ТЭЛЕФОННЫЯ ПАСЛУГІ ДАРАЖЭЮЦЬ

**Павялічваюцца тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання для фізічных, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.**

Так, месячная абанентная плата за стацыянарны тэлефон індывідуальнага карыстання будзе складаць для насельніцтва пасля павышэння тарыфаў 12 250 руб. За кожную поўную ці няпоўную хвіліну тэлефоннага злучэння давядзецца заплаціць 29,8 руб. А за хвіліну размовы з міжгароднім абанентам 72,6 руб. за хвіліну.

Пры гэтым, як для фізічных, так і для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, тарыфы на шэраг паслуг засталіся на ранейшым узроўні. Без змяненняў засталася плата за паслугі доступу да інтэрнэту ў пунктах калектыўнага карыстання. Не змянілася і плата за прадстаўленне доступу да мясцовай тэлефоннай сувязі (за падключэнне тэлефона).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПЕРШЫЯ АХВЯРЫ ВАДЫ...

**Купальны сезон толькі распачаўся, а на вадзе ўжо адбылася не адна трагедыя: за мінулыя выхадныя ў краіне патанулі чатыры чалавекі, сярод якіх дзіця...**

Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у Дняпры ў Магілёве каля паўдня патанула дзяўчынка 2007 года нараджэння. Яе маці і непрацуючы сябар купаліся разам з дзіцем, і яго аднесла цячэннем... Яшчэ адно паведамленне ў гэты ж дзень паступіла з Віцебскай вобласці. Кампанія з трох чалавек заўважыла нешта на беразе Заходняй Дзвіны. Адзін з мужчын вырашыў пераплысці раку. Нырнуў і не вынырнуў. А ўвечары ў Мазыры на Прыпяці ўтапіўся яшчэ адзін мужчына: на беразе засталіся толькі яго рэчы. Напярэдадні ахвярай вады стаў мужчына, які нырнуў у Сляпянскую водную сістэму каля вуліцы Каліноўскага ў сталіцы. Згодна з папярэдняй версіяй, ён быў нападпітку...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЭКС-ДЫРЭКТАРА ФАБРЫКІ «СЛОДЫЧ» ПРЫГАВАРЫЛІ ДА ТРОХ ГАДОЎ ЗНЯВОЛЕННЯ

**Тры гады калоніі агульнага рэжыму ды пазбаўленне права на працягу пяці гадоў займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых функцый — такі прысуд прагучаў на адрас былой дырэктаркі кандытарскай фабрыкі «Слодыч».**

Пракурор прасіў зняволіць падсудную на пяць гадоў, але суд улічыў той факт, што яна добраахвотна кампенсавала нанесеную прадпрыемству шкоду, і вынес больш мяккае пакаранне.

Паводле слоў кіраўніка прэс-службы Вярхоўнага суда Юліі Лясковай, экс-дырэктарка кандытарскай фабрыкі праслухоўвала размовы сваіх падначаленых праз свой працоўны камп'ютар, да якога было падключана адмысловае абсталяванне. Апошняе абвінавачаная распарадзілася набыць за кошт прадпрыемства ў камерцыйнай фірмы і ўсталяваць у кабінетах некаторых падначаленых.

Следчыя знайшлі аўдыязапісы размоў супрацоўнікаў прадпрыемства як службовага, так і асабістага характару на камп'ютары экс-дырэктаркі. Ахвярамі праслухоўвання сталі больш за 35 чалавек. Шкода, нанесеная непасрэдна кандытарскай фабрыцы, звязаная з закупкай абсталявання і яго ўстаноўкай, ацэнена ў 202 млн рублёў. Прысуд можа быць абскарджаны ў вызначаным законам парадку.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## ДЗЕВЯЦЬ РЫБІН ЗА ВОСЕМ МІЛЬЁНАЎ

**Трактарыст Лунінецкага ЖКГ лавіў у Прыпяці рыбу. Мала таго, што ў забаронены час, дык яшчэ з дапамогай сеткі.**

І ўлоў быў небагаты, у сетку трапіла тры ліні і шэсць карасёў, калі парушальніка затрымалі работнікі Мікашэвіцкай міжраённай інспекцыі аховы расліннага і жывёльнага свету. Але ўрон, нанесены прыродзе, быў ацэнены ў 8 100 000 рублёў, што складае 54 базавыя велічыні. А гэта падстава для пачатку крымінальнай справы. Так што, дзевяць рыбін абыдуцца 31-гадоваму трактарысту, відавочна, значна больш чым у 8 мільёнаў рублёў. Дык ці варта так рызыкаваць?

**Яна СВЕТАВА.**

## НЕРВОВЫЯ КЛЕТКІ АДНАЎЛЯЮЦЦА Ў ЛЮБЫМ УЗРОСЦЕ

**Сучасная навука даказала здольнасць нервовых клетак чалавека аднаўляцца ў любым узросце.**

Як паведамляе ІТАР-ТАСС, прафесар Гётынгенскай клінікі ў Германіі Г. Хютэр правёў шматгадовы эксперымент, падчас якога вяліся назіранні за канадскімі манашкамі. Іх узрост перавышаў 100 гадоў. Мозг манашак рэгулярна абследавалі з дапамогай магнітна-рэзананснай тамаграфіі (МРТ). Даследаванні паказвалі наяўнасць у мозгу гэтых жанчын прыкмет нейрадэгенератыўных захворванняў, характэрных для хваробы Альцгеймера і хваробы Паркінсона, але ніякіх клінічных праяў старэчага бяспамяцтва ў іх не назіралася. Даследчык прыйшоў да высновы, што «прычынай захавання ў манашак-доўгажыхарак патэнцыялу аднаўлення мазгавых структур з'яўляюцца ўзгодненасць паміж чаканнямі і рэальнасцю, устойлівая карціна свету і актыўная дзейная пазіцыя — маліцца, каб змяніць свет да лепшага».

Г. Хютэр таксама распавёў, што з дапамогай, напрыклад, МРТ, мікрадыялізу (тонкага хімічнага аналізу) і электрафізіялагічных даследаванняў навукоўцы ўбачылі, як стрэс падаўляе здольнасць мозга да рэгенерацыі, а вырашэнне праблемы прыводзіць да аднаўлення нервовай тканкі і яе праводнасці. «Гэта адбываецца ў любым узросце, а не толькі ў дзіцячым, але ў рознай ступені. Працэс ідзе інтэнсіўней, калі вам 20, і больш павольна, калі 70, але ён ідзе!» — паведаміў прафесар.

**Вольга ДЗЯЖНЁВА, «Мінск—Навіны».**

ВАКОЛ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ХАКЕІ

# «Сувенірка» прыйшлася даспадобы

**З 26 мая гандлёвыя арганізацыі аднавілі рэалізацыю поўнага асартыменту тавараў з лагатыпам чэмпіянату свету па хакеі з шайбай.**



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

Сёння прадукцыю з лагатыпам і нацыянальныя беларускія сувеніры прадаюць у сталічных універмагах, прадпрыемствах гандлю прамысловага, харчовага і змешанага профілю, кавярнях і рэстаранах, аб'ектах гандлю ў гасцініцах, кіёсках і павільёнах РУП «Белсаюздрук» і РУП «Белпошта». Гэта паштоўкі і буклеты, канверты, паштовыя маркі, сшыткі і блакноты, флікеры, сурвэткі, халаты для лазні і сувенірная прадукцыя з дзяржаўнай сімволікай, нацыянальнай тэматыкай.

У фан-зонах лядовых арэн рэалізацыю афіцыйнай сувенірнай прадукцыі вяла шведская кампанія «Neh» (камерцыйны партнёр Міжнароднай федэрацыі хакея).

Як паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, найбольшым попытам у жыхароў і гасцей Мінска ў перыяд правядзення чэмпіянату карысталіся тавары коштам да 500 тысяч рублёў. Гэта магніты з сімволікай рэгіёнаў і гарадоў, значкі з адлюстраваннем сцягоў краін, што ўдзельнічалі ў чэмпіянаце, а таксама сувенірная тэматычная прадукцыя з дрэва, шкла, керамікі, фарфору, саломкі, ільновалакна. Яна прысвечана вядомым гістарычным і культурным мясцінам і адлюстроўвае нацыянальны каларыт. Тут павышаным попытам карысталіся выявы зуброў, лялькі, сувенірныя талеркі, кубкі і інш. Ахвотна жыхары і госці сталіцы набывалі сцягі (і з тканіны, і з паперы), даведнікі, недарагія фотаальбомы, святлоадбівальныя элементы. Добра разыходзіліся скургалантарэйныя вырабы (асабліва з натуральнай скуры), адзенне з лёну і воўны, камплекты пасцельнай бялізны, трыкатажныя вырабы (шалікі, фуфайкі з дзяржаўнай сімволікай, нацыянальнай тэматыкай, выявай хакеіста і г. д). Вядома ж, карысталіся попытам тавары спартыўнай атрыбутыкі (дудкі, шапкі), сродкі для малявання на твары і целе сцягоў, эмблем і іншай сімволікі.

Найбольш актыўныя продажы ў арганізацыях гандлю назіраліся ў першыя дні правядзення чэмпіянату. У цэлым рэалізацыя названай прадукцыі павялічылася ў сярэднім на 20–40 працэнтаў.

# Хакей глядзелі, дранікі са смятанай елі

**Тавараварот за 17 дзён работы аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання на дзвюх спартыўных арэнах, у фан-зонах і ў трох зонах гасціннасці склаў 46 мільярдаў рублёў. Было прададзена 420 тысяч літраў піва, 27 тон шашлыку, больш за 53 тоны каўбасак і курыных крыльцаў грыль.**



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

Паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, каля «Мінск-Арэны» за гэтыя дні разышлося 127 тысяч літраў піва, каля «Чыжоўка-Арэны» — 52 тысячы літраў. Каля Палаца спорту жыхары сталіцы і госці чэмпіянату выпілі 96 тысяч літраў пеннага напою, з'елі каля 20 тон шашлыку, набылі сувенірнай прадукцыі больш як на мільярд рублёў. У Студэнцкай вёсцы разышлося 140 тысяч літраў піва, зону гасціннасці наведала больш за 122 тысячы чалавек. Каля Мінскага лядовага палаца спорту было прададзена 4,5 тысячы літраў піва, ахвотныя набылі тут сувеніраў на 27,5 мільёна рублёў.

Аб'ём рознічнага тавараабароту аб'ектаў грамадскага харчавання за 17 дзён на дзвюх арэнах склаў каля 20 мільярдаў рублёў.

Самая вялікай была зона гасціннасці каля Палаца спорту — 13 тысяч квадратных метраў. Больш за 2 тысячы пасадачных месцаў, каля 400 чалавек абслуговага персаналу. Штодня гэтую пляцоўку наведвалі каля 120 тысяч чалавек. Зона гасціннасці працавала да апошняга пакупніка, фактычна з 10.00 да 3.00–4.00.

Падчас правядзення паўфіналаў і фіналу чэмпіянату найбольшым попытам у гасцей турніру карысталіся стравы з грыльменю, шашлык і марозіва беларускай вытворчасці. У зонах гасціннасці каля Палаца спорту і ў Студэнцкай вёсцы штодня прадавалася больш за 600 кілаграмаў дранікаў са смятанай, якія сталі хітом продажу. У іншых аб'ектах грамадскага харчавання, размешчаных у горадзе, хітом замоў таксама былі дранікі ва ўсіх варыянтах: з белымі грыбамі і соусам, фаршыраваныя з мясам у гаршчочках, са скваркамі і г. д. Папулярнасцю ў гасцей карысталіся і іншыя стравы беларускай нацыянальнай кухні. Рэстаратары адзначылі попыт на алкагольныя напіткі айчыннай вытворчасці. Асноўнымі наведвальнікамі кавярняў і рэстаранаў былі балельшчыкі з Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Чэхіі і Фінляндыі.

# На свяце «хварэлі» мірна

**25 мая ў Мінску завяршыўся чэмпіянат свету па хакеі. У гэты дзень у святочных мерапрыемствах прынялі ўдзел больш за 210 тысяч чалавек.**

Так, на тэрыторыі комплексу студэнцкіх інтэрнатаў «Студэнцкая вёска», каля Палаца спорту і Мінскага гарадскога лядовага палаца спорту прайшлі канцэртныя праграмы. З 1.30 да 2.15 у раёне зоны гасціннасці каля Палаца спорту адбылося лазернае 3D-шоу.

Паводле інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, найбольшая колькасць грамадзян узяла ўдзел у святочных мерапрыемствах у зонах гасціннасці. Каля Палаца спорту прысутнічала каля 140 тысяч чалавек, у «Студэнцкай вёсцы» — каля 40 тысяч, каля комплексу «Мінск-Арэна» — прыкладна 30 тысяч. А ўсяго цягам дня ў святочных мерапрыемствах узялі ўдзел больш за 210 тысяч чалавек. Сур'ёзных парушэнняў грамадскага парадку і надзвычайных здарэнняў не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ТРЭЦІ ЎЗРОСТ

## 73-ГАДОВАЯ РАІСА БАРАНЧЫК ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ НА ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

**Раіса Юльеўна не ўтойвае свайго хвалявання — раз-пораз папраўляе валасы, шчокі гараць... Ёй толькі што ўрачыста ўручылі сертыфікат аб праходжанні навучання на факультэце сацыяльнай работы і псіхалогіі ва Універсітэце трэцяга ўзросту ў Мінску. І такіх, як яна, выпускнікоў у зале яшчэ 148 чалавек! Многія жанчыны (язык не паварочваецца назваць іх бабулямі) — на абцасах, са стыльнай біжутэрыяй, у модных касцюмах або ў джынсах, некаторыя — у эфектных чырвоных сукенках. Мужчын нашмат менш, але і яны прыгожыя і ўрачыстыя.**

— З дзяцінства ў мяне была прага новых ведаў, — радасна ўсміхаецца ўжо знаёмая нам Раіса Баранчык. — І да гэтага часу хочацца пазнаваць нешта новае. Выпадкова мая знаёмая сказала, што пры Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва нашага Першамайскага раёна адкрываюцца камп'ютарныя курсы. Я запісалася і скончыла іх. Калі яшчэ вучылася, даведалася, што праводзіцца набор ва Універсітэт трэцяга ўзросту, на розныя факультэты. Псіхалогія мне была заўсёды цікавая, і я пайшла вучыцца на гэты факультэт (па першай адукацыі Раіса Юльеўна інжынер-канструктар).

Там жанчына сустрэла вельмі цікавых людзей.

— Яны пражылі доўгае жыццё, ім ёсць чым падзяліцца — сваімі ведамі, вопытам, здольнасцямі, — кажа Раіса Юльеўна. — Моладзь дарма цяпер не прыслухоўваецца да такіх людзей. Наша група добра згуртавалася, усе пасябравалі, сталі адзін аднаму амаль роднымі людзьмі. Можа, мы так не сышліся б, калі б толькі слухалі лекцыі. Але кожны тыдзень па серадах з намі праводзілі трэнінгі. Там былі сумесныя заданні, тэсты, дзякуючы якім мы лепш пазнаёміліся. Наша выкладчыца Воля — вельмі адказны чалавек, так рыхтавалася кожны раз, так перажывала за нас! І праводзіла заняткі па цікавых тэмах: кантакты паміж людзьмі, як развіць сваю памяць... Я заўсёды чакала гэтых заняткаў, як свята!

На гэтым Раіса Юльеўна не плануе заканчваць сваё навучанне. У верасні яна збіраецца на факультэт журналістыкі. Марыць і аб англійскай мове. «У маладосці, калі я вучылася, мовам не надавалі належнай увагі», — кажа яна.

***

А 65-гадовы Станіслаў Кавалёў цяпер, можна сказаць, наш калега — ён ужо скончыў факультэт журналістыкі. Праўда, гэтая справа для Станіслава Аляксандравіча не такая і новая, ён ужо мае амаль 200 публікацый, але ў асноўным навуковых. Доўгія гады працаваў у сістэме адукацыі: выкладаў у школе, потым, пасля аспірантуры, займаўся павышэннем кваліфікацыі педагогаў. У 2008 годзе цяжка захварэў, прайшоў праз шэсць анкалагічных аперацый, атрымаў інваліднасць. З таго часу ўжо не працаваў. Пра гэты ўніверсітэт даведаўся выпадкова. «Прыйшоў, запісаўся, — распавядае ён. — Я дапамагаў праводзіць заняткі і сам актыўна пісаў: ва ўніверсітэта ёсць свой сайт, там і былі апублікаваныя мае артыкулы. І мы не толькі хадзілі на заняткі, але і ездзілі разам на экскурсіі. Атрымалі цудоўныя ўражанні!».

Дарэчы, Станіслаў Аляксандравіч аказаўся адзіным мужчынам у групе. Ну што рабіць, калі жанчыны ў нас больш актыўныя ва ўсіх узростах, больш цягнуцца да ведаў, часцей ходзяць на культурныя мерапрыемствы дый жывуць даўжэй... Але Станіслаў Аляксандравіч, між іншым, не адстае ад іх. У далейшых планах у яго — вывучэнне нямецкай мовы.

***

— Пажылых людзей, якія хочуць вучыцца, аказалася вельмі шмат, — кажа **Таццяна БАЛЕНДА, кіраўнік праекта «Універсітэт трэцяга ўзросту: новыя шанцы для сацыяльнага ўключэння».** — Мы нават не чакалі такога напльіву. Аб'яў аб наборы слухачоў мы практычна не давалі, пажылыя людзі шукалі нас самі...



**Пажылыя хочуць вучыцца, многіх з іх цікавіць камп'ютар і замежныя мовы...**

Навучанне тут вядзецца на чатырох факультэтах: замежных моў (англійская і нямецкая), журналістыкі, сацыяльнай працы і псіхалогіі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Яно разлічана на год, заняткі праходзяць 1–2 разы на тыдзень па 2 акадэмічныя гадзіны.

Навучае пажылых людзей моладзь — студэнты і ўчарашнія студэнты. Усе яны працуюць у якасці валанцёраў. «Мы запрашалі іх праз універсітэты, вешалі афішы, выкладвалі інфармацыю ў сацыяльныя сеткі, размяшчалі ў інтэрнэце. Добра дапамагала і «сарафаннае радыё», — кажа Таццяна Баленда. — Маладым людзям было цікава праявіць сябе ў якасці выкладчыкаў, пашырыць кола сваіх знаёмстваў. Да таго ж, як аказалася, многіх з іх прываблівала тое, што гэтая справа прыносіць рэальную карысць людзям».

У цэлым усё, паводле слоў Таццяны Баленды, атрымалася, як у звычайным універсітэце: былі групы больш дружныя, былі менш. А некаторыя так з'ядналіся, што сталі ледзь ці не адзінай сям'ёй. Як водзіцца, былі і свае лідары, і выдатнікі, і двоечнікі...

На сённяшні дзень ва ўніверсітэце ўжо адбыўся выпуск трох факультэтаў: журналістыкі, сацыяльнай працы і псіхалогіі і факультэта замежных моў — усяго атрымалі сертыфікаты аб навучанні каля 150 чалавек. Да таго ж, універсітэт сумесна з МТС працуе па праграме «Сетцы ўсе ўзросты пакорныя», бо камп'ютарныя тэхналогіі карыстаюцца проста шалёнай папулярнасцю. Навучанне ім сёння праводзіцца ў чатырох цэнтрах сталіцы. У лютым было выпушчана 300 чалавек, і ў бліжэйшы час будзе выпуск яшчэ 500 чалавек — у выніку за год з камп'ютарам асвоіліся 800 чалавек. «Калі падвесці агульныя вынікі — мы навучылі ўжо 950 пажылых людзей!» — з гонарам кажа Таццяна Баленда.

Застаецца дадаць, што гэты запатрабаваны ў грамадстве праект рэалізуе Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў пры фінансавай падтрымцы МГА «Узаемаразуменне», фонду «Памяць, адказнасць і будучыня» (Германія). У будучыні, як спадзяецца каардынатарка праекта, да фінансавання гэтай справы, магчыма, далучацца і беларускія ўстановы.

**Святлана БУСЬКО.**

# БЭБІ-БУМ У БАБРУЙСКУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Не пазнаць стары радзільны корпус, ад якога, напэўна, засталіся толькі сцены. Каб матулі і іх немаўляткі не мерзлі, будынак уцяплілі. Пасля рэканструкцыі кіслароднага пункта тут быў усталяваны пакуль адзіны ў вобласці кіслародны канцэнтратар, які забяспечвае ўсю ўстанову неабходным запасам кіслароду і дапамагае эканоміць бюджэтныя сродкі.

На тое, каб стварыць сучасныя ўмовы для Бабруйскай радзільні, спатрэбілася 87 мільярдаў рублёў. І гэта каштавала тых грошаў. Як адзначыў галоўны ўрач Бабруйскай цэнтральнай бальніцы Уладзімір Гацко, радзільны дом быў пабудаваны амаль паўстагоддзя таму і ўжо не адпавядаў сучасным нормам і патрабаванням. Пакуль ішоў рамонт, матуль прымалі адначасова некалькі медыцынскіх устаноў горада, але ўжо ў пачатку мая яны ўсе пераехалі ў адноўленыя аддзяленні.

— Мы ўсе яшчэ знаходзімся ў нейкай эйфарыі, — кажа галоўны ўрач Ірына Сіманенка. — Чытаем водгукі ў інтэрнэце і радуемся. Тыя, хто не збіраўся нараджаць другое дзіця, сталі задумвацца пра гэта.




Фота Аляксандра АНТАШКЕВІЧА.

Алена Яворская якраз з ліку тых, хто збіраецца нараджаць тут другое дзіця. Першаму споўнілася 17 гадоў, ён ужо зусім самастойны чалавек. І стала адчувацца, што ў доме не хапае дзіцячага смеху, цацак, гульняў. Тым больш першынец быў хлопчык, а жанчыне сумна без дзяўчынкі. Менавіта дачушку чакае цяпер шчаслівая маці. Пакуль яна знаходзіцца тут на захаванні і радуецца новым умовам.

— Тое, што было, і што стала — не параўнаць, гэта неба і зямля, — адзначае яна. — Раней у палаце па 5–6 чалавек знаходзілася, а цяпер боксы на дваіх. Ёсць халадзільнік, новая мэбля, бялізна. І вельмі зручная свяцільня над ложкам. Усё прадумана. Нават сцены пафарбаваны ў прыемны салатавы колер. Гэта супакойвае. Не ва ўсіх дома бывае так утульна.

Ці чакаць дзіцячага буму ў Бабруйску? — цікаўлюся ва Уладзіміра Гацко. «Трэба спадзявацца, — усміхаецца ён. — Але ж, мяркуючы па тым, колькі сёння будучых матуль стаіць на ўліку, можна казаць, што так яно і будзе».

Дарэчы, як адзначыла Ірына Сіманенка, з 12 па 21 мая ў новых умовах нарадзіліся першыя 100 немаўлят, сярод іх — 2 двойні. З пачынам!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Добрая справа

# Я ЦЯБЕ РАЗУМЕЮ

**Шэфства над выхаванцамі Асарэвіцкага дзіцячага сацыяльнага прытулку, што ў Брагінскім раёне, узялі прадстаўнікі бельгійскай дабрачыннай асацыяцыі «Дзеці Чарнобыля»**

Іх візіты ў Беларусь, як і нашых дзяцей у Бельгію, сталі традыцыйнымі. Кожны раз валанцёры знаходзяць тых, каму сапраўды патрэбна маральная і матэрыяльная дапамога. Дарэчы, за два дзясяткі гадоў супрацоўніцтва ў гэтым кірунку з беларускай арганізацыяй «Будучыню — дзецям» атрымалася зрабіць многае. Як высветлілася, такія ўзаемныя стасункі аднолькава патрэбны абодвум бакам і даўно перараслі ў сяброўства.

Сярод валанцёраў з Бельгіі — людзі самых звычайных прафесій: акушэрка, выратавальнік, настаўніца, пенсіянер... Каб сабраць сродкі для ўвасаблення сваіх сацыяльных праектаў, актывісты арганізоўваюць розныя дабрачынныя акцыі. Напрыклад, запрашаюць дадому сяброў, для якіх накрываюць вялікі стол. Пры гэтым кожны з тых, хто прыйшоў, ахвяруе пэўную суму грошай на дабрачыннасць. Хтосьці займаецца хэндмэйдам і зробленае сваімі рукамі таксама аддае на добрую справу.

Бельгійцы, калі прыязджаюць у Беларусь, праводзяць творчыя ўрокі, фотасесіі, спектаклі, спартыўныя эстафеты... Сёлета пабывалі вось у сем'ях і сацыяльных установах Брагіна, Асарэвічаў, Чырвонага, Камарына. Між іншым, на гэты раз заўважылі, што ў Брагінскім раённым карэкцыйна-развіваючым і рэабілітацыйным цэнтры дзецям з адхіленнямі псіхафізічнага развіцця аказваюць дапамогу на высокім узроўні. Дыд'е Гаспар, прэзідэнт асацыяцыі «Дзеці Чарнобыля», адзначае, што такой добрай арганізацыі справы варта павучыцца:

— Дзеці з асаблівасцямі развіцця вучацца ў спецыялізаваных класах, з кожным вучнем працуе некалькі спецыялістаў: лагапед, выкладчык ЛФК, псіхолаг... У іх праходзіць нармальная сацыялізацыя. Увогуле ж нам важна мець адваротную сувязь з беларускімі сем'ямі, каб разумець і бачыць, што такая дабрачынная работа мае сэнс.

Анры Леконт — віцэ-прэзідэнт асацыяцыі, які быў адным з ініцыятараў яе стварэння, гаворыць, што кругагляд дзяцей, якія прыязджаюць адпачываць у іншую краіну, значна пашыраецца.

Моўнае пытанне для дзяцей — не такая вялікая перашкода ў стасунках, як для дарослых. Ды і юныя беларусы значна лягчэй засвойваюць французскія словы, асабліва, калі ў сям'і, якая прымае, ёсць дзеці. Аднак без казусаў не абыходзіцца. Адзін з класічных такі. Дзяцей пытаюцца: «Ca va?» (скарочана — «як справы?») Практычна ўсе спачатку ўпэўнены, што ад іх хочуць даведацца пра нейкую саву. Але ж звычайна праз тыдзень-два беларускія школьнікі ўжо пачынаюць разумець французскую мову.

Самыя трывалыя стасункі — на асобасным узроўні. Менавіта яны і дапамагаюць знаходзіць агульную мову, кропкі сутыкнення і магчымасці для ўзаемаразумення. Для нас гэта сапраўды важны вопыт: навучыцца шчыра ставіцца да болю іншых людзей і не баяцца прыйсці на дапамогу тым, каму яна патрэбна, бескарысліва ахвяраваць свой час і свае станоўчыя эмоцыі іншым людзям.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



**Заняткі з дзецьмі з Асарэвіцкага дзіцячага сацыяльнага прытулку.**

# Незабыўныя кветкі «Вясновага букета»



**Майстры-настаўніцы з Быхаўскай дзіцячай школы рамёстваў Ірына Кухціна з дачкой Аляксандрай і Ірына Лысянкова**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Дзякуючы Беларускаму саюзу майстроў, у мінскі куток над Свіслаччу амаль з усіх раёнаў Беларусі прывезлі свае творы некалькі соцень рупліўцаў, сярод якіх было нямала і тых, каму нададзена ганаровае званне народнага майстра.

Гэта свята не толькі для саміх майстроў, але і для сталічных жыхароў і гасцей Мінска. Людзі ідуць сюды, каб наглядзецца на творы-кветкі, набыць (трэба заўважыць, нятанна) і, галоўнае, выкарыстаць магчымасць пазнаёміцца з самімі творцамі. Бо хіба лёгка паехаць за 300 кіламетраў на Магілёўшчыну ў старажытны Крычаў, каб у майстра-кераміста Вячаслава Якавенкі набыць свісцёлку ў выглядзе вершніка на птушцы?! Альбо ў вёску Рэкта Жлобінскага раёна да Ганны Серафімовіч, каб убачыць унікальную калекцыю драўляных лялек, апранутых у народныя строі ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Альбо ў Гарадок на Віцебшчыну — да саломапляцельшчыка Васіля Сімаковіча, які, бадай, адзіны ў Беларусі валодае тэхналогіяй вырабу кубла альбо кузубаў.

Сёлетняму «Вясноваму букету» спрыяла шчодрае сонейка і чысцюткі блакіт нябёсаў. У віры свята асаблівай кветкай стала і сцэнічная пляцоўка, з якой несліся спевы ў выкананні сапраўдных аматараў роднага слова і народнай песні, адданых захавальнікаў непаўторнай фальклорнай спадчыны нашай зямлі.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**



**За працай — дырэктар Гарадоцкага дома рамёстваў Васіль Сіманковіч.**



**Народны майстар Вячаслаў Якавенка з жонкай Любоўю дэманструе ўзоры аднаўленай старажытнай глінянай свісцёлкі.**

# НЕ ЖЭСАЎСКІ КЛОПАТ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Практыка прыцягнення сродкаў насельніцтва да добраўпарадкавання жыллёвых тэрыторый у Мінску існуе з 2010 года, калі было прынята рашэнне Мінгарвыканкама «Аб утрыманні і рамонце жылых дамоў». Паводле яго з насельніцтвам праводзіцца тлумачальная работа і на дагаварной аснове ў добраахвотным парадку жыхары могуць выдаткоўваць грошы на замену і ўстаноўку дзіцячага абсталявання, рамонт пад'ездаў, балконаў, уцяпленне фасадаў, прачыстку ствалоў смеццеправодаў, усталяванне агароджаў, закупку кантэйнераў, пляцовак, малых архітэктурных формаў, азеляненне... Падрабязная інфармацыя пра тое, на якія віды работ прыцягваюцца сродкі жыхароў, змяшчаецца на сайтах жыллёвых службаў, ЖРЭА, адміністрацый раёнаў.

Адметна, што найбольш актыўна жыхары звяртаюцца па дапамогу ва ўсталяванні дадатковых элементаў на дзіцячых пляцоўках, асабліва ў новых раёнах, куды засяляюцца маладыя сем'і. Справа ў тым, што «мінімальнае» абсталяванне дваравой тэрыторыі прадугледжана ў праектна-сметнай дакументацыі дома, які будуецца. Аднак некаторыя лічаць, што і дадатковыя прыстасаванні павінны ўсталёўвацца за бюджэтныя сродкі, але гэта не так. Цяпер усё больш маладых бацькоў разумеюць сваю адказнасць за гарманічнае развіццё дзяцей, таму за ўласныя грошы імкнуцца разнастаіць дзіцячыя «гарадкі» ў дварах.

**Як ніколі актыўна людзі цяпер даглядаюць агародчыкі каля пад'ездаў — высаджваюць кветкі, робяць альпійскія горкі. Жыхары ў гэтым плане ў нас малайцы.**

— Складана сказаць, у колькі абыходзіцца жыхарам усталяванне дадатковых прадметаў у двары. Тыя ж самыя лавачкі могуць быць рознымі — са спінкамі і без, мудрагелістых формаў, таму і кошт можа быць розны — і 300 тысяч рублёў, і 600, і мільён. На дзіцячае ж абсталяванне давядзецца выдаткаваць мінімум 1,5 млн рублёў, — адзначыла Зінаіда Ставер.

Грошы немалыя, але «непад'ёмнымі» яны могуць здавацца толькі на першы погляд. Каб зменшыць выдаткі на добраўпарадкаванне двара, жыхарам дома ці пад'езда варта вырашаць гэтае пытанне разам: у падзеле на агульную колькасць кватэр нават істотная сума акажацца не такой вялікай, і кожны будзе ганарыцца сваім унёскам у прыгажосць каля дома. Дарэчы, не трэба хвалявацца, што нехта можа сапсаваць купленыя вамі прадметы і грошы будуць патрачаны дарма: пасля ўстаноўкі новых арэляў ці горкі жыллёвыя службы будуць сачыць за іх станам і ажыццяўляць бясплатны рамонт.

## Прыгажосць сваімі рукамі

Зрэшты, для таго, каб родны двор радаваў вока, а ў пад'ездзе было чыста і ўтульна, зусім не абавязкова звяртацца па дапамогу ў спецыяльныя інстанцыі і выдаткоўваць вялікія грошы. Пра гэта сведчаць штогадовыя агляды-конкурсы па добраўпарадкаванні, у якіх жыхары прэзентуюць свае двары і пад'езды, прыгажосць каторых стварылі ўласнымі рукамі і сродкамі. Зінаіда Ставер прызналася, што многія ідэі афармлення ствараюць моцнае ўражанне.

**Некаторыя лічаць, што дадатковыя прыстасаванні ў дварах павінны ўсталёўвацца за бюджэтныя сродкі, але гэта не так.**

— Мне вельмі спадабалася, як у адным з пад'ездаў сцены пафарбавалі пры дапамозе трафарэту, і атрымаліся нібы белыя карункі на зялёным полі. А яшчэ нехта прыдумаў выкласці кветкі з люстэркавымі пялёсткамі — глядзелася вельмі прыгожа. Як ніколі актыўна людзі цяпер даглядаюць агародчыкі каля пад'ездаў — высаджваюць кветкі, робяць альпійскія горкі. Жыхары ў гэтым плане ў нас малайцы.

Вынікі конкурсаў падводзяцца да Дня горада, і ўдзельнікі атрымліваюць падзякі і памятныя падарункі — яшчэ адзін прыемны бонус падтрымання ў належным стане тэрыторыі вакол свайго жылля. Ды і без дадатковых заахвочванняў, па словах Зінаіды Ставер, культура жыхароў ва ўтрыманні прыжыллёвых тэрыторый з часам толькі павялічваецца.

— Не пагаджуся, што ў добраўпарадкаванні тэрыторый зацікаўленыя адзінкі. Цяпер многія наводзяць прыгажосць вакол свайго жытла, а калі атрымліваюць падзякі па выніках конкурсаў, ганарацца імі і нават вешаюць іх у сваіх пад'ездах. Мне думаецца, усё больш жыльцы схіляюцца да прынцыпу «Гэта мой дом, і я ў ім гаспадар».

Што ж, так ужо створаны чалавек: найбольш цэніць тое, за што плаціць.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯ Ў НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ВЫЗНАЧЭННЯ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ

**Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 красавіка 2014 года**
**Адобраны Саветам Рэспублікі 22 красавіка 2014 года**

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 1999 года «Аб пражытачным мінімуме ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 5, 2/14; 2008, № 3, 2/1396) наступныя змяненні і дапаўненне: 1. У артыкуле 1:

абзац другі выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«пражытачны мінімум — неабходныя для захавання здароўя чалавека, забеспячэння яго жыццядзейнасці мінімальны набор прадуктаў харчавання і нехарчовыя тавары і паслугі, кошт якіх вызначаецца як фіксаваная доля ад кошту мінімальнага набору прадуктаў харчавання;»;

абзац чацвёрты пасля слова «пенсіянеры,» дапоўніць словам «студэнты,».

2. Артыкул 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 3. Парадак вызначэння, зацвярджэння і перагляду пражытачнага мінімуму**

Пражытачны мінімум вызначаецца з удзелам зацікаўленых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, рэспубліканскіх аб'яднанняў наймальнікаў і прафесійных саюзаў, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь і пераглядаецца не радзей за адзін раз у пяць гадоў.

Пражытачны мінімум складаецца з:

мінімальнага набору прадуктаў харчавання;

нехарчовых тавараў і паслуг.

Мінімальны набор прадуктаў харчавання для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва вызначаецца на падставе нормаў спажывання, якія распрацоўваюцца Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, а таксама навуковымі арганізацыямі.

Нехарчовыя тавары і паслугі ўключаюцца ў пражытачны мінімум як фіксаваная доля ад кошту мінімальнага набору прадуктаў харчавання. Фіксаваная доля нехарчовых тавараў і паслуг вызначаецца на падставе зводных статыстычных даных (інфармацыі) аб фактычным аб'ёме спажывання малазабяспечанымі грамадзянамі (сем'ямі) нехарчовых тавараў і паслуг.».

3. У частцы другой артыкула 4 слова «Урадам» замяніць словамі «Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны».

4. У частцы першай артыкула 7 словы «мінімальнага памеру аплаты працы» замяніць словамі «мінімальнай заработнай платы».

5. У артыкуле 8 словы «выданнях рэспубліканскага і мясцовага друку» замяніць словамі «перыядычных друкаваных выданнях».

**Артыкул 2.** Абзац чацвёрты часткі першай артыкула 16 Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1521) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«сцвярджае пражытачны мінімум;».

**Артыкул 3.** У частцы пятай артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 06.01.2013, 2/2005) словы «Саветам Міністраў» замяніць словамі «Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны».

**Артыкул 4.** Да зацвярджэння бюджэту пражытачнага мінімуму Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь дзейнічае бюджэт пражытачнага мінімуму, зацверджаны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 5.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у чатырохмесячны тэрмін:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 6.** Гэты закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

артыкулы 1—4 — праз чатыры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА**

*7 мая 2014 года, г. Мінск*
*№ 148—3*

## Карагоды на Сёмуху

**У першую нядзелю лета ў Чавускім раёне, што на Магілёўшчыне, адбудзецца другі міжрэгіянальны конкурс карагодаў.**

Ён пройдзе ў рамках мясцовага фэсту «Зялёныя святкі» каля жыватворнай крыніцы Байкава, якая, па павер'ях, вылечвае ад многіх захворванняў. Чакаецца, што ўдзел у ім прымуць прадстаўнікі з 12 раёнаў Магілёўшчыны, запрошаны і са Смаленска.

Наведвальнікаў свята чакае цікавая стылізаваная дзея, сустрэчы з народнымі ўмельцамі, магчымасць прыняць удзел у старадаўніх абрадах «Кумаўя» і «Завязванне бярозы».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. № 98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. № 98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада – площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть, инв. № 98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус, инв. № 98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса, инв. № 98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная, инв. № 98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. № 98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. № 98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га.

Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 40% и составляет с НДС – 46 980 650 880 бел. руб.**

**Задаток 5% от начальной цены (2 349 032 544 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by**.

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 06.05.2014.*

Аукцион состоится **12.06.2014** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.06.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска»**

**(в дополнение ранее опубликованной в газете «Звязда» от 19 октября 2013 года проектной декларации)**

Застройщик – Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 г. за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., д. 64а.

**Тел./факс:** 204-67-99, 399-53-94

**Режим работы** – 8.45 – 18–00, обед 13.00 – 14–00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 23 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Десятиэтажный жилой дом на 79 квартир, выполненный на базе изделий модернизированной серии М 464-М, состоит из 2-х секций. Здание имеет технический отапливаемый этаж (чердак) и техническое подполье. Высота жилых этажей (от пола до пола) – 2,8 м. В объеме технического подполья предусмотрены технические помещения для инженерного обслуживания здания – тепловые пункты.

Каждая секция жилого дома оборудована мусоропроводом и пассажирским лифтом грузоподъемностью 400 кг. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные лоджии и балконы).

Наружная отделка – покрытие защитно-декоративным полимерным составом.

Окна и балконные двери – деревянные с заполнением двухкамерным стеклопакетом.

Двери – по СТБ 1138-98, СТБ 1647, СТБ 1394.

Остекление лоджий – по СТБ 1912.

Внутренняя отделка – оклейка стен и потолков обоями в жилых комнатах, прихожих; в кухнях – оклейка стен обоями влагостойкими, акриловая покраска потолков; водостойкая акриловая покраска стен в ванных и санузлах. Покрытие полов жилых помещений и кухонь – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, в ванных и санузлах – керамическая плитка.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **12 квартир, в том числе:**

**4 двухкомнатных квартиры (2 квартиры площадью 67,96 кв.м, 1 квартира площадью 69,14 кв.м, 1 квартира площадью 68,64 кв.м);**

**8 трехкомнатных квартир (6 квартир площадью 92,75 кв.м, 2 квартиры площадью 92,94 кв.м).**

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в жилом доме № 23 по генплану на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов по состоянию на апрель 2014 года и составляет: при строительстве двухкомнатной квартиры составляет **12 800 000 белорусских рублей,** трехкомнатной квартиры – **11 682 200 рублей.**

Начало строительства – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 30 сентября 2014 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству объекта можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., д. 64а, к. 102, тел. 399-53-94.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.



**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске просит опровергнуть сведения, опубликованные в газете «Звязда» № 92 (27702) от 21 мая 2014 г., о признании недействительными:**

- страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 3327630, 3335979;
- квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 0899311.

УНП 100706519


■ Будзь у курсе

# ЗБРОЯ ПАТРАБУЕ РЭГІСТРАЦЫІ

**Да 1 ліпеня грамадзянам, якія маюць не ўлічаную ва ўстаноўленым парадку зброю, трэба звярнуцца — для яе рэгістрацыі ці здачы — у органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства.**



Для рэгістрацыі трэба напісаць заяву, дзе ўказаць від, тып, мадэль, калібр, серыю, нумар зброі, якая не знаходзіцца на ўліку, і прад'явіць дакумент, што сведчыць асобу. Калі грамадзяне жадаюць здаць такую зброю без далейшай рэгістрацыі, пішацца заява аб яе добраахвотнай здачы. У абодвух выпадках разам з заявамі ў орган унутраных спраў прадстаўляецца і сама зброя. Усё афармляецца актам у трох экзэмплярах, адзін з якіх — разам са зброяй — на працягу месяца накіроўваецца ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. Гэты орган займаецца сертыфікацыяй зброі — абавязковаму пацвярджэнню адпаведнасці патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі.

Сертыфікацыя зброі, уключаючы яе выпрабаванне, праводзіцца на бясплатнай аснове, у тым ліку без уплаты дзяржаўнай пошліны за выдачу сертыфіката адпаведнасці, на працягу двух месяцаў са дня паступлення зброі ў орган сертыфікацыі. Пры гэтым праводзіцца кантрольны адстрэл агнястрэльнай зброі з наразным ствалом (у тым ліку камбінаваным), а таксама праверка куль і гільз па крыміналістычных уліках. Па выніках сертыфікацыі на зброю выдаецца або сертыфікат адпаведнасці, або рашэнне аб адмове ў выдачы такога дакумента. Адмова можа быць і па прычыне адсутнасці боепрыпасаў і немагчымасці іх набыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

Атрымаўшы ад органа па сертыфікацыі або сертыфікат адпаведнасці, або адмову аб выдачы такога дакумента, тэрытарыяльны орган унутраных спраў на працягу пяці дзён паведамляе пра тое грамадзяніну. Пры гэтым у выпадку прыняцця рашэння аб магчымасці рэгістрацыі зброі, якая не знаходзіцца на ўліку, грамадзянін павінен забяспечыць па месцы пражывання ўмовы для яе захоўвання. На працягу месяца ён павінен прадаставіць у тэрытарыяльны орган унутраных спраў: дзве фатаграфіі памерам 30х40 мм; дакумент аб уплаце дзяржаўнай пошліны ў памеры дзвюх базавых велічынь за выдачу дазволу на захоўванне і нашэнне зброі (за кожную адзінку); медыцынскую даведку пра стан здароўя; дзяржаўнае пасведчанне на права палявання — для рэгістрацыі паляўнічай зброі; членскі білет спартыўнай арганізацыі па кулявой стральбе, які пацвярджае занятак прафесійнай ці аматарскай дзейнасцю, звязанай з гэтым відам спорту, не менш за пяць гадоў, — для рэгістрацыі спартыўнай зброі.

Калі грамадзянін не прадаставіць на працягу месяца патрэбных дакументаў або не здолее забяспечыць па месцы пражывання ўстаноўленых заканадаўчымі актамі ўмоў для захоўвання зброі, яна падлягае знішчэнню ва ўстаноўленым парадку ці перадачы ў калекцыі дзяржаўных воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый, мытных органаў ці органаў пракуратуры.

Пры рэгістрацыі зброі, што не знаходзіцца не ўліку, грамадзяніну, на якога яна рэгіструецца, выдаецца дазвол на захоўванне і нашэнне тэрмінам на тры гады, які потым можа падаўжацца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Эканоміка

# БОЛЬШ ЧЫМ НА ТРЭЦЬ павялічыўся экспарт Беларуськалія

## Найбуйнейшая айчынная кампанія плануе ў маі і чэрвені экспартаваць каля 1 млн тон прадукцыі штомесяц

**Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Беларуськалій» Валерый Кірыенка.**

У прыватнасці, ён сказаў, што сёлета за студзень—красавік прадпрыемства вырабіла ўжо 3,4 млн тон угнаенняў. Гэта амаль на 22% больш, чым за аналагічны перыяд летась. Кіраўнік адзначыў, што калі ў мінулым годзе Беларуськалій, гандлюючы праз сумесную з Расіяй кампанію, ільвіную долю прадукцыі пастаўляў на ўнутраны рынак, то сёлета за чатыры месяцы на ўнутраны рынак пастаўлена 300 тысяч тон, а на экспарт — ужо больш за 3 млн тон. Тэмпы павелічэння экспарту складаюць 41,1%. Па здабычы руды вытворчасць таксама мае рэкордныя паказчыкі, бо за чатыры месяцы сёлета гарнякі «паднялі» больш за 14 млн тон (плюс 17,4%).

Нагадаю, што раней прадпрыемства трапіла ў вельмі складаную сітуацыю, ад якой страты неслі не толькі беларускія, але і іншыя вытворцы, а самае галоўнае — цярпелі пакупнікі. «Але мы не толькі выйшлі з гэтай сітуацыі, але ў сакавіку паставілі рэкорд за ўсе гады працы прадпрыемства і вырабілі больш за 1 млн тон прадукцыі, а на экспарт паставілі 977 тысяч тон. Такі ж узровень экспарту плануецца ў красавіку, маі і чэрвені; цяпер фарміруюцца будучыя аб'ёмы на ліпень», — удакладніў гендырэктар.

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі прадпрыемства за студзень—красавік узрасла амаль на 15% і склала 8,5 трлн рублёў. Чысты прыбытак павялічыўся ў 4,1 раза і склаў каля 2,2 трлн рублёў. Па выніках года плануецца атрымаць не менш 4 трлн рублёў прыбытку.

Валерый Кірыенка адзначыў, што айчынныя ўгнаенні сёння прадаюцца даражэй, чым у канадцаў і рускіх. Гэта факт. З'явілася тэндэнцыя самастойнага росту цаны без усялякіх змоў паміж вытворцамі. Спекуляцыйная ці дэмпінгавая стратэгіі цяпер не працуюць, бо падобная палітыка нервуе пакупніка. Спадар Кірыенка лічыць, што ў гэтай сітуацыі патрэбна стабільнасць і справядлівая цана як для вытворцаў, так і для пакупнікоў. Яна павінна складаць прыкладна 350-400 долараў за тону прадукцыі. «Калі прытрымлівацца такога кошту, то і пакупнік будзе адчуваць стабільнасць. Гэта разумее кітайскі і індыйскі рынак», — падкрэсліў кіраўнік прадпрыемства.

Цяпер сусветны рынак патрабуе больш грануляваных угнаенняў. У свой час Саўмін даручыў Беларуськалію павялічыць магутнасці па вытворчасці гранулявaных угнаенняў і пастаўляць на ўнутраны рынак такую прадукцыю. Даручэнне ўрада было выканана, і з 11 млн тон агульнага аб'ёму прадукцыі 60% выпрабляецца цяпер у гранулявaным выглядзе. А вось «Уралкалій» сёння можа вырабляць толькі 30% гранулявaных угнаенняў ад агульнага аб'ёму.

Нагадаю, што акцыянернае таварыства «Беларуськалій» з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў і экспарцёраў калійных угнаенняў у свеце. Паводле звестак Міжнароднай асацыяцыі ўгнаенняў, на яго долю прыпадае сёмая частка сусветнага аб'ёму вытворчасці калійных угнаенняў. Беларуськалій экспартуе прадукцыю ў больш чым 70 краін. На прадпрыемстве дзейнічае чатыры рудаўпраўленні, а таксама дапаможныя і іншыя падраздзяленні. Увесь пакет акцый «Беларуськалія» належыць дзяржаве.

**Сяргей КУРКАЧ**


**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:**

- страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 3327630;
- квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 3335979, 0899310.

УНП 100706519



**Минский райисполком отказывается от проведения аукциона по продаже земельных участков в частную собственность 27 июня 2014 года в отношении следующего земельного участка:**

1) Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома площадью 0,1549 га, Минский район, Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 2, кадастровый номер земельного участка 623685505101000352. (Лот 11).

УНП 600052411



ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 100071325

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА**

«Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану».

Продовольственный магазин (5 пусковой комплекс) в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 01 июня 2013 года:

**Ожидаемый ввод продовольственного магазина в эксплуатацию – 1 июля 2014 года.**

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества ОАО «Белинвестбанк»**

| | | | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Павильон по оказанию банковских услуг ВЦ «Аквабел» (инв. №50046222) и смонтированный в нем кондиционер LG B24-LH (инв. №50046223) | Адрес: Минская обл., Минский р-н, д. Боровая, 1, территория ВЦ «Аквабел» | 702 000 000 | 70 000 000 | 5 |

Год постройки – 2008. Размер павильона – 11,8 м х 11,08 м. Электроосвещение, теплоснабжение, телефонная связь имеются. Вентиляция – кондиционирование, естественная.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) вправе оплатить единовременно (в течение 20-ти рабочих дней с момента заключения договора) либо на следующих условиях рассрочки:

- 30% цены Объекта оплачиваются в течение 10-ти рабочих дней с момента заключения договора, оставшаяся сумма – равными долями в течение 12-ти месяцев с момента заключения договора;
- за предоставление рассрочки ежемесячно уплачиваются проценты, начисляемые на непогашенную сумму рассрочки в размере ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь.

Передача Объекта производится в течение 5 (пяти) банковских дней с момента оплаты цены Объекта при единовременной оплате (в течение 20-ти рабочих дней с момента заключения договора), либо с момента оплаты 30% цены Объекта при оплате с рассрочкой.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пяти процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 30.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос.регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Белинвестбанк»,* **проводимом 30 июня 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **26.06.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников **30.06.2014 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: 8 (029) 377-48-01 Млечко Дмитрий Станиславович.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

Краіна здароўя
Выпуск № 8 (319)



■ Псіхалогія для ўсіх

# МАНІПУЛІРУЙ... АЛЕ НЕ МНОЙ

**Нярэдка мы сутыкаемся з тым, што іншыя людзі жадаюць кіраваць нашымі паводзінамі. У псіхалогіі такое кіраванне называецца маніпуляцыяй. Ці можна ад гэтага абараніцца?**



— Першым дзеяннем у псіхалагічнай абароне з'яўляецца ўсведамленне самога факту маніпуляцыі, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена ДРАВІЦА.** — Калі вы спрабуеце «расшыфраваць» чужыя паводзіны, арыентуйцеся на свае адчуванні! Падмануць розум можна, а вось падсвядомасць — амаль немагчыма. Дапусцім, вы не хочаце выконваць нейкія дзеянні, але вымушаны іх выконваць, таму што інакшай гэта будзе «няёмка», «эгаістычна», «па-хамску», «непрыгожа» і г.д. Словам, вы будзеце выглядаць у дрэнным свеце і не апраўдаеце давер. Такім чынам вы падсілкоўваеце канфлікт унутры сваёй асобы: «Хіба я магу быць такім?».

Пакуль мы не ўсведамляем маніпулятыўнасць, мы не прымаем абарончых дзеянняў. Базавыя абарончыя механізмы маўчаць. Самым старажытным спосабам абароны варта прызнаць уцёкі. Следам за імі — заміранне і хаванне ва ўкрыцці. І толькі пасля — сустрэчны напад на агрэсара, імкненне паўплываць на яго паводзіны.

Аднак ёсць і пасіўная абарона. Самы бяспечны спосаб абараніцца ад маніпуляцыі. Яго можна прымяняць ва ўмовах недахопу часу, калі невядома, што рабіць, і да таго ж не хочацца «псаваць адносіны».

## ЯКІЯ МЕТАДЫ МОГУЦЬ СПРАЦАВАЦЬ?

Проста не рэагуйце на словы маніпулятара, быццам не пачулі ці не заўважылі.

Прыкіньцеся, быццам не разумееце, пра што гаворка.

Перавядзіце размову на іншую тэму.

«Пагаджаючыся» з прапановай маніпулятара, абавязкова скажыце, што канчатковае рашэнне прыміце крыху пазней, што вам неабходна падумаць.

Захоўвайце вытрымку, самавалоданне.

## ЯК ЗАХАВАЦЬ САМАВАЛОДАННЕ?

✓ **Разглядванне.** У вострай сітуацыі атрымання негатыўнай інфармацыі неабходна сканцэнтравацца не на тым, што і як кажа суразмоўца, а на тым, што можна разглядзець у яго знешнасці і наваколлі. Няхай той, хто іграе на нашых нервах, працягвае гаварыць. А вы павінны запамінаць дэталі, нібыта гэта вам неабходна для малявання карціны. Раптоўнае маўчанне аслабіць напор маніпулятара.

✓ **Візуалізацыя.** Наша ўяўленне здольнае на цуд. Уявіце маніпулятара ў такім стане, які вам было б прыемна сузіраць (з крыламі матылька, напрыклад); можна зменшыць рост чалавека (уявіць яго ліліпутам, гномам, прусаком); надаць пэўны камізм (дамаляваць ва ўяўленні «сямейныя» трусы або шапку-аблавуху); выдумаць сцэну рэваншу і атрымаць асалоду ад «помсты».

✓ **Поўны спакой.** Заўсёды больш эфектыўна сесці і засяродзіцца, глыбока падыхаць, папіць вады. Толькі не мітусіцца.

✓ **Захаванне паўзы.** Так больш верагодна сфармулюецца патрэбны адказ. Можна прывучыць сябе адказваць толькі пасля таго, як далічыш да 10-ці.

✓ **Невербальныя знакі.** Вельмі важна сачыць за тым, што адбываецца з вашым целам. Прамая спіна, роўнае дыханне, цвёрды позірк самі па сабе абараняюць ад маніпулятараў.

## ЯКОЙ МОЖА БЫЦЬ АКТЫЎНАЯ АБАРОНА?

Калі ёсць магчымасць не баяцца канфлікту, можна нанесці контрудар.

Скажыце аб тым, што не падабаецца. Можна задаваць пытанні «Што менавіта вам патрэбна?», «Скажыце прама, да чаго вы мяне схіляеце?». Гэта ўзмацняе псіхалагічную абарону.

Пачніце сваю гульню. Неабходна адказаць маніпулятару яго ж прыёмамі, паказаць сваю псіхалагічную моц. У такіх выпадках можна працягваць маніпуляцыю, але пад сваім кантролем і ў сваіх інтарэсах. Можна пачаць цалкам сваю маніпуляцыю.

Скажам, малазнаёмы суразмоўца прымяняе словы «коцік», «мілачка», «Ігарок» і г.д. Такім чынам устанаўліваецца псіхалагічная перавага, робіцца «прыбудова зверху». У такім выпадку неабходна пачаць звяртацца да суразмоўцы падобным жа чынам, пакуль ён не зразумее, што не зможа націснуць.

## УНІВЕРСАЛЬНЫЯ СПОСАБЫ АБАРОНЫ АД МАНІПУЛЯЦЫЙ

**Вучыцеся гаварыць «не».** Інакш вы былі і застаняцеся лепшай здабычай для маніпулятараў. Кожны мае права гаварыць «не», кожны мае права адмаўляцца. Вымавіць гэта слова рашуча здольны толькі той, хто адмовіўся ад жадання падабацца ўсім без выключэння. Такі намер усё роўна беспаспяховы. Думайце лепей пра свае патрэбы.

**Вытрымлівайце дыстанцыю.** Маніпулятары лёгка атрымліваюць інфармацыю аб «ахвярах» не таму, што такія разумныя, а дзякуючы празмернай даверлівасці людзей.

**Беражыце свае эмоцыі.** Не ідзіце ад сваіх пачуццяў віны або абавязку. І не адказвайце агрэсіяй на агрэсію. Галоўнае — памятаць асноўную задачу прыёмаў маніпулявання (адцягваць ад уласных інтарэсаў, збіваць з толку, атрымліваць выгоду, выкарыстоўваючы скажоную рэакцыю). Каб не апраўдаць чаканні маніпулятара, варта дакладна і цвёрда захоўваць у свядомасці свае галоўныя інтарэсы, заставацца на пазіцыях рэальнасці ва ўспрыняцці сваіх прыярытэтаў, самім сабой.

**Будзьце непрадказальнымі.** Калі маніпулятар не можа «пралічыць» ахвяру, ён не можа і ўплываць на яе. Немагчыма атрымаць перамогу, калі правілы гульні пастаянна мяняюцца.

**Не хваліцеся.** Пахвальба — лепшы спосаб прымусіць іншых зайздросціць, а для маніпулятара гэта яўная дэманстрацыя слабых бакоў патэнцыйнай ахвяры, указанне на мішэнь уздзеяння. Тыя, хто ведае пра гэта, свядома сціпла паводзяць сябе.

А наогул галоўная зброя супраць маніпуляцый — мір. Не варта атакаваць першым. Дастаткова ў прынцыпе даць зразумець, што маніпулятар не дасягне сваіх мэт.

■ Адкрытая тэма

# НІЯКАЙ ТАЛЕРАНТНАСЦІ?..



## ВІЧ-інфіцыраваныя жанчыны могуць нараджаць здаровых дзяцей, але грамадства не гатовае даць ім такую магчымасць

**60 працэнтаў беларусаў лічаць, што дзяржава павінна ізаляваць ад грамадства ВІЧ-інфіцыраваных людзей. Такія звесткі атрыманы падчас даследавання фонду «Фокус-Медыя», праведзенага ў межах праекта «Падтрымка сеткі ВІЧ-станоўчых жанчын Расіі, Украіны і Беларусі». Жанчын з ВІЧ не прымаюць на працу, ім адмаўляюць у медыцынскай дапамозе, ад іх адварочваюцца родныя і знаёмыя. ВІЧ-пазітыўныя жанчыны сутыкаюцца і з асаблівай формай дыскрымінацыі — спробай абмежаваць іх сексуальныя і рэпрадуктыўныя правы, звязаныя з цяжарнасцю і нараджэннем дзяцей. Скажам, нярэдка акушэры-гінеколагі пачынаюць «агляд» такой цяжарнай са слоў «вы не хацелі б пазбавіцца ад дзіцяці?». Наогул многія беларускія ўрачы не праяўляюць талерантнасці ў дачыненні да «пазітыўных» пацыентаў. Нелаяльна ставіцца да такіх людзей і ў цэлым грамадства.**

У межах усё таго ж апытання ў беларусаў спрабавалі даведацца, што яны будуць рабіць, калі побач з іх дзецьмі акажуцца дзеці з ВІЧ? 40 працэнтаў рэспандэнтаў сказалі, што перавялі б сваё дзіця ў іншую ўстанову (садок, школу), 6 працэнтаў запатрабавалі б ад адміністрацыі пераводу ў іншую ўстанову такога дзіцяці і яшчэ 35 працэнтаў разгубіліся з адказам, што таксама не выключае наяўнасці падобных настрояў.

— Сёння ў нашай краіне пражывае каля 12,5 тысячы зарэгістраваных ВІЧ-інфіцыраваных, і палова з іх — жанчыны, у тым ліку і тыя, хто хоча мець сям'ю і дзяцей, — расказвае **загадчыца аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІД Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена ФІСЕНКА.** — І тут узнікае пытанне аб вертыкальным шляху перадачы ВІЧ-інфекцыі — ад маці да дзіцяці. Наша грамадства хоць і добра інфармаванае па праблеме ВІЧ, аднак не схільнае ставіць гэтую інфекцыю ў шэраг іншых хранічных захворванняў. Між тым медыцына ведае досыць шмат аб тым, як папярэдзіць перадачу ВІЧ ад маці дзіцяці. ВІЧ-станоўчыя жанчыны могуць нараджаць здаровых дзяцей. Рызыку перадачы ВІЧ ад маці да дзіцяці, якое яна выношвае, пры правядзенні прафілактычных мерапрыемстваў падчас цяжарнасці і родаў можна знізіць да 1 працэнта і меней.

ВІЧ-інфекцыю пакуль немагчыма цалкам вылечыць, аднак антырэтравірусная тэрапія дазваляе знізіць тэмп развіцця захворвання. Ужыванне спецыяльных прэпаратаў дае магчымасць жыць без усялякіх сацыяльных абмежаванняў. Лекі настолькі зніжаюць вірусную нагрузку ў арганізме, што чалавек не здольны перадаваць вірус іншым і можа весці звыклы для яго лад жыцця. Важна толькі як мага раней пачаць лячэнне.

Сёння дасягненні медыцыны фактычна прыраўноўваюць ВІЧ да хранічных захворванняў. Аднак грамадства вельмі кансерватыўна ставіцца да гэтай тэмы. Усё таму, што веды па тэме ВІЧ не абнаўляюцца ў светлых галовах. Большасць нашых людзей па-ранейшаму, як і гадоў дваццаць таму, лічаць, што ВІЧ — гэта праблема маладых, асабліва тых, што ўжываюць ін'екцыйныя наркотыкі, а таксама мужчын, якія маюць секс з мужчынамі, і жанчын секс-бізнесу. Між тым ВІЧ не меў і тым больш не мае ніякіх межаў. Паступова вірус стаў асабліва актуальным не для тых, каму каля 20-ці, а для тых, каму пасля 30-35-ці, якія пераканалі сябе, што могуць «спаць спакойна». І ў такога перакanання ёсць вынік — у 85 працэнтах выпадкаў ВІЧ сёння перадаецца палавым шляхам. Аднак тыя, каму бліжэй да сарака, не задумваюцца над гэтым. Істотная частка насельніцтва нават рэпрадуктыўнага ўзросту не бярэ за правіла рэгулярна здаваць тэст на ВІЧ. З гэтай прычыны колькасць афіцыйна зарэгістраваных выпадкаў і тое, што ёсць насамрэч, істотна адрозніваюцца. Наогул у Беларусі зарэгістравана 16 169 выпадкаў (на 1 красавіка г.г.). Ацэначная ж колькасць — каля 25 тысяч. Словам, далёка не ўсе ведаюць праўду аб сваім здароўі.

### КАБ НЕ БАЯЦЦА ВІЧ

*ВІЧ не перадаецца праз слёзы, сліну або пот. Канцэнтрацыя віруса ў гэтых вадкасцях вельмі нізкая. Лічыцца, што для заражэння спатрэбіцца 3 літры сліны інфіцыраванага чалавека.*

**ВІЧ не перадаецца праз пацісканне рук і абдымкі. Скура чалавека — непераадольны бар'ер для віруса.**

*ВІЧ не перадаецца праз ручнікі, адзенне, пасцельную бялізну, паколькі ён хутка гіне ў знешнім асяроддзі.*

У сярэднім на працягу года каля 300 ВІЧ-станоўчых жанчын у нашай краіне становяцца на ўлік па цяжарнасці. Палова з іх даведваюцца пра наяўнасць віруса пасля таго, як зацяжаралі, а значыць, пачаць антырэтравірусную тэрапію як мага раней у іх не атрымліваецца. Больш за тое, у шэрагу выпадкаў гэтыя жанчыны з'яўляюцца яшчэ і залежнымі ад ужывання наркотыку. Такая катэгорыя пацыентак лічыцца самай закрытай. І не толькі для знаёмых, але і для ўрачоў. Замест таго, каб адкрыць свой статус, дакладней, абодва, яны проста маўчаць, з-за чаго пазбаўляюць сябе шанцу вырашыць нават самыя простыя пытанні са здароўем.

Закрытасць, няправільнае стаўленне да сучасных магчымасцяў медыцыны, невытрымліванне ўрачэбных рэкамендацый і прыводзяць часам да выяўлення ВІЧ-інфекцыі ў народжанага дзіцяці. У ідэале такому дзіцяці таксама прызначаецца пажыццёвая антырэтравірусная тэрапія. Хоць і тут не ўсё так проста. Кажуць, некаторыя чуллівыя бабулі надта ж шкадуюць унукаў і часам... адмяняюць ненавісную «хімію», што прыводзіць да істотнага зніжэння эфектыўнасці лячэння!

**Паступова вірус стаў асабліва актуальным не для тых, каму каля 20-ці, а для тых, каму пасля 30-35-ці, якія пераканалі сябе, што могуць «спаць спакойна».**

— У краіне няма комплекснай дапамогі ці, скажам, спецыяльных медцэнтраў для абслугоўвання ВІЧ-пазітыўных пацыентаў, — кажа **спецыяліст па рабоце з сем'ямі, якія закрануў ВІЧ, тэматычны каардынатар Беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» Ірына СТАТКЕВІЧ.** — У арганізацыі ж можна атрымаць толькі кансультацыйна-псіхалагічную дапамогу. Па дапамогу медыцынскую трэба звяртацца па месцы жыхарства. На жаль, практыка паказвае, што ўрачы любой спецыялізацыі не надта дружалюбныя. Тыя ж акушэры-гінеколагі дэманструюць цалкам прадузятыя адносіны: абсалютная большасць, паводле апытанняў, перакананы, што людзі з ВІЧ вядуць бязладнае сексуальнае жыццё, што яны не цікавяцца сваім здароўем і г.д. Аднак ВІЧ-пазітыўным пастаянна патрабуецца хаця б кансультацыйная дапамога — іх трэба падтрымаць на самым пачатку антырэтравіруснай тэрапіі (яна сёння прапануецца абсалютна ўсім людзям з дыягназам «ВІЧ-інфекцыя»), затым на працягу гэтага лячэння, паколькі ёсць схемы, паводле якіх камусьці дастаткова адной-дзвюх таблетак на суткі, а некаму даводзіцца ўжываць па некалькі прэпаратаў некалькі разоў на дзень. Гэта не так проста, асабліва на першым этапе, калі арганізм пакрысе прыстасоўваецца да лячэння. Неабходна пастаянна падсілкоўваць матывацыю ВІЧ-пазітыўных, каб яны не адмаўляліся ад лячэння. Тым больш не адмянялі яго самавольна свайму дзіцяці... А калі дзіця дасягне 8-12-гадовага ўзросту, раскрылі яму праўду, патлумачылі, што таблеткі, якія даводзіцца піць, — не «вітамінкі». Замоўчваць праўду — абсалютнае глупства і недальнабачнасць...

Антырэтравірусную тэрапію ўсе, каму яна паказана, атрымліваюць бясплатна. Такая практыка застаецца магчымай дзякуючы адпаведным грантам Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Дарэчы, летась у нашай краіне была наладжана фасоўка і ўпакоўка прэпаратаў антырэтравіруснай тэрапіі.

**Вера, 30 гадоў: «Бацькі вылучылі мне асобны посуд»**

*— Я працую трэнерам па фізкультуры ў дзяцей у прыватнай школе. Люблю спартыўныя мерапрыемствы, катацца на веласіпедзе і роліках, люблю сабак, падарожжы, новыя знаёмствы... Я даведалася пра свой дыягназ, калі мне было 20 гадоў: праходзіла планавае абследаванне на працы ў медустанове. Аказалася, што ў мяне антыцелы да ВІЧ. Мяне ўпершыню напаткала пачуццё, што Бог скінуў мяне са сваіх рук. Мне было вельмі сорамна. Так сорамна, што я звольнілася. Мае бацькі не валодалі інфармацыяй і вылучылі мне асобны посуд. Я і сама лічыла сябе «брудная».*

*Але я не стала ізалявацца, як многія іншыя. У мяне адкрыты розум і медыцынская адукацыя! Я расказала сябрам, і ніхто не палохаецца абдымкаў са мной, не баіцца піць з аднаго кубка, не хавае сваіх дзяцей. Пакуль гэты дыягназ ніяк не паўплываў на маё жыццё, я проста вытрымліваю меры засцярогі... Зараз у мяне адносіны з мужчынам, які не з'яўляецца ВІЧ-станоўчым. Ён прыняў мяне і не баіцца блізкасці са мной. Я вельмі хачу сям'ю і дзяцей і ведаю, што ва ўмовах сучаснага свету і прагрэсу ў медыцыне гэта магчыма. У мяне ёсць мэты і планы на будучыню...*

**Рызыку перадачы ВІЧ ад маці да дзіцяці, якое яна выношвае, пры правядзенні прафілактычных мерапрыемстваў можна знізіць да 1 працэнта і меней.**

**Наташа, 37 гадоў: «Ёсць хваробы і больш страшныя»**

*— Ёсць людзі ў больш складаных жыццёвых сітуацыях. І сярод іх ёсць шчаслівыя. Калі я думаю пра гэта, прычын шкадаваць сябе не застаецца. Інфармацыя аб захворванні ліквідуе страх! Беражыце сваё здароўе, любіце сябе. З ВІЧ вы або без ВІЧ.*

*У мяне ёсць дачка, любімы мужчына, шмат сяброў... У 1997 годзе я скончыла медвучылішча і пачала працаваць па спецыяльнасці. Праз тыдзень пасля ўладкавання ў бальніцу мяне выклікала старшая медсястра і сказала, што мне не трэба сюды больш прыходзіць. Бо ў мяне знайшлі ВІЧ. «Як добра што мы не паспелі афарміць цябе афіцыйна», — з палёгкай дадала яна. У той момант будучыня перастала для мяне існаваць. Я закрываю сёння свой твар толькі з-за таго, што мой дыягназ можа даставіць непрыемнасці маім блізкім. Бо нават медыкі не маюць дастаткова ведаў па маім захворванні: медсястра ў раддзільні сказала, што з маім дыягназам нельга карыстацца тэлефонам, які стаіць на пасту (!). Было крыўдна да слёз.*

*Я расказала пра дыягназ сваім самым блізкім сябрам, пасля маці, потым яшчэ некаторым сябрам, і з палёгкай адчула, што стаўленне да мяне не мяняецца. Пабывала ва ўрачоў, высветліла, чым ВІЧ адрозніваецца ад СНІДу і што трэба рабіць, каб захоўваць сваё здароўе як мага даўжэй.*

### ВАЖНЫЯ ФАКТЫ

• Тэарэтычна можна заразіцца ВІЧ-інфекцыяй, скажам, падчас бойкі (калі ў рану аднаго чалавека трапіць кроў іншага). Аднак на практыцы такая магчымасць не даказана — не зафіксавана ніводнага падобнага выпадку. У тым жа дзіцячым садку, школе і г.д. могуць цалкам бяспечна выхоўвацца дзеці з рознымі статусамі.

• Прыкладна кожнае трэцяе дзіця з ВІЧ-інфекцыяй выхоўваецца ва ўмовах інтэрнатных устаноў. Аднак у апошні час павялічваецца колькасць выпадкаў апякунства, усынаўлення і г.д. такіх дзяцей. Ідуць на гэта, праўда, пераважна сем'і медработнікаў.

• Лакальныя псіхалагічныя даследаванні адкрываюць цікавыя звесткі. Аказваецца, дзеці, якіх празмерна апякаюць, «залюбліваюць», якія атрымліваюць максімальную бацькоўскую падтрымку, больш схільныя да рызыкоўных паводзін! Справа ў тым, што ў такіх умовах дзеці падсвядома засвойваюць просты факт: што б ні здарылася, ёсць на каго перакласці груз непрыемных наступстваў.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Доктар адкажа

# ШТО РАБІЦЬ З ПРЫЛІВАМІ?

**«Мне 48 гадоў. Часам пакутую ад так званых прыліваў. Што вы параіце? Як сябе правільна паводзіць у гэты час? Чым можа дапамагчы медыцына такім жанчынам, як я?**

*Галіна, г. Гомель».*

**Тлумачыць урач акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Аляксандра СТАНКЕВІЧ:**

— Звычайна трэць жанчын не адчуваюць надыход менапаўзы, трэць сутыкаецца са слабымі ці сярэдне выяўленымі сімптомамі, а ў астатняй трэці развіваюцца цяжкія сімптомы, якія патрабуюць гарманальнага лячэння.

Клімактэрый — так называецца фізіялагічны час у жыцці жанчыны, на працягу якога ў арганізме дамінуе інвалюцыя ў рэпрадуктыўнай сістэме. Клімактэрычны сіндром — паталагічны стан, які ўзнікае ў часткі жанчын у клімактэрычным перыядзе і праяўляецца нервова-псіхічнымі, вегетатыўна-сасудзістымі і абменна-трафічнымі расстройствамі.

Змяненні менструальнага цыкла могуць пачацца ў жанчын у 40 гадоў, яны праяўляюцца нерэгулярнымі менструацыямі. Менапаўза надыходзіць у сярэднім у 50 гадоў. Ранняй менапаўзай называюць спыненне менструацыі да 45 гадоў, заўчаснай менапаўзай (або заўчаснай недастатковасцю яечнікаў) — спыненне менструацыі да 40 гадоў.

## У КЛІМАКТЭРЫЯ ЁСЦЬ НЕКАЛЬКІ ФАЗ:

Прэменапаўза — перыяд ад першых менапаўзальных сімптомаў да апошняй самастойнай менструацыі.

Менапаўза — апошняя самастойная менструацыя, абумоўленая функцыяй яечнікаў (дату вызначаюць праз 12 месяцаў адсутнасці менструацыі).

Перыменапаўза — час, які аб'ядноўвае прэменапаўзу і 1 год пасля менапаўзы.

Постменапаўза — час ад менапаўзы да 65-69 гадоў. Вылучаюць раннюю (да 5 гадоў) і познюю (ад 5 да 10 гадоў).

## ПАТАЛАГІЧНЫЯ СТАНЫ ДЗЕЛЯЦЦА НА ТРЫ ГРУПЫ:

*1-я група. Раннія сімптомы.*

«Прылівы» гарачкі, павышаная патлівасць, галаўны боль, гіпа- або гіпертанія, сэрцабіццё (вазаматорныя). Раздражнёнасць, санлівасць, слабасць, неспакой, дэпрэсія, забыўлівасць, няўважлівасць, зніжэнне лібіда (эмацыянальна-псіхічныя).

*2-я група. Сярэднечасовыя сімптомы.*

Сухасць похвы, боль пры палавых кантактах, сверб, урэтральны сіндром (урагенітальныя). Сухасць, ломкасць пазногцяў, маршчыны, сухасць і выпадзенне валасоў (скурныя).

*3-я група. Познія сімптомы.*

Астэапароз, сардэчна-сасудзістыя захворванні (абменныя).

Менапаўза можа не суправаджацца сімптомамі, але да 85 працэнтаў усіх жанчын пасля натуральнай і амаль усе жанчыны пасля хірургічнай менапаўзы маюць сімптомы дэфіцыту эстрагенаў: гарачыя прылівы, патлівасць, бяссонніцу і г.д.

Клімактэрычны сіндром можа праяўляцца абсалютна па-рознаму, і гэта часам абцяжарвае вызначэнне ступені цяжару захворвання. Традыцыйна па колькасці прыліваў клімактэрычны сіндром дзеліцца на лёгкую форму (да 10 разоў за суткі), сярэднюю (10-20 прыліваў), цяжкую (звыш 20 прыліваў за суткі плюс іншыя сімптомы, пры якіх жанчына амаль цалкам губляе працаздольнасць).

## ШТО РАБІЦЬ ДЛЯ ПРАФІЛАКТЫКІ ГАЛОЎНЫХ ПРАБЛЕМ МЕНАПАЎЗЫ?

Правільна харчавацца, рэгулярна займацца фізкультурай (30-40 хвілін 3-6 разоў на тыдзень), трымацца здаровага ладу жыцця.

## ЯК ЛЯЧЫЦЬ?

Лячэнне паказана пры сярэдняй і цяжкай ступенях клімактэрычнага сіндрому. Найбольш часта прымяняецца замяшчальная гарманальная тэрапія аналагамі палавых гармонаў — эстрагенаў і прагесцінаў. Аднак у шэрагу выпадкаў такое прызначэнне абмяжоўваецца некаторымі медыцынскімі супрацьпаказаннямі. Акрамя таго, не ўсе жанчыны пагаджаюцца на прыём гармонаў па тых ці іншых прычынах. У такіх сітуацыях адаптавацца да новых умоў існавання ва ўмовах дэфіцыту эстрагенаў жанчыне дапамагаюць альтэрнатыўныя метады лячэння.

**1.** Гомеапатычныя сродкі.

**2.** Фітатэрапія. Фітагармоны — гэта рэчывы раслiннага паходжання. Іх змяшчаюць, напрыклад, цыміцыфуга, соя, чырвоная канюшына, бульба, мельбразія, рапантыцын.

**3.** Медыкаментозная негарманальная тэрапія (антыдэпрэсанты, транквілізатары, сардэчна-сасудзістыя, гіпатэнзіўныя сродкі, прэпараты кальцыю, магнію).

**4.** Дыетатэрапія (агародніна, садавіна, алей — іх колькасць у рацыёне павінна пераважаць).

**5.** Фізіялячэнне. Іголкарэфлексатэрапія.

**6.** Гімнастыка, спорт, водныя працэдуры.

**7.** Вітаміны і антыгіпаксанты.

Замяшчальная гарманальная тэрапія з'яўляецца другаснай прафілактыкай хвароб і адносіцца да першай лініі лячэння клімактэрычных расстройстваў. Перад прызначэннем такой тэрапіі для выяўлення супрацьпаказанняў прызначаецца абследаванне:

ультрагукавое абследаванне органаў малога таза, мамаграфія, цыталагічнае даследаванне мазкоў, гарманальнае даследаванне, біяхімічны аналіз крыві, ліпідаграма, остэадэнсітаметрыя.

*Клімакс — пачатак новага этапу жыцця, які можна гэтак жа цікава і актыўна пражыць, як і папярэднія гады. Неабходна ўсвядоміць, што надышоў час адмовіцца ад шкодных звычак, з асцярожнасцю ставіцца да ўжывання алкаголю. Пастаянны рух і збалансаванае харчаванне дапамогуць прафілактыцы астэапарозу і захворванняў сэрца і сасудаў. У ідэале тая ж гарманальная тэрапія — рацыянальнае дапаўненне да здаровага ладу жыцця. Жыццесцвярджальны настрой, пільная ўвага да свайго фізічнага і душэўнага стану — вырашальныя моманты для захавання высокай якасці жыцця.*

■ Харчовы гандаль

# БЕЗ УСЯКІХ САНІТАРНЫХ НОРМАЎ!

**85 працэнтаў рынкаў, аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і прыдарожнага сэрвісу краіны парушаюць санітарныя нормы і правілы. Пры гэтым максімум парушэнняў было выяўлена ў Мінску (у 100% выпадкаў), а мінімум — у Віцебскай вобласці (77% выпадкаў). Дзяржаўныя санітарныя ўрачы абласцей, сталіцы і органаў дзяржаўнага кіравання абследавалі ў першыя чатыры месяцы гэтага года звыш 14 тысяч згаданых аб'ектаў.**

## ШТО ЎДАЛОСЯ ВЫЯВІЦЬ?

- рэалізацыю пратэрмінаванай харчовай прадукцыі;
- парушэнне тэмпературнага рэжыму рэалізацыі харчовай прадукцыі;
- нездавальняючы санітарны стан памяшканняў, гандлёвага і тэхналагічнага абсталявання;
- адсутнасць дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку харчовых прадуктаў;
- несвоечасовасць медаглядаў, гігіенічнага навучання работнікаў;
- невыкананне прадпісанняў у вызначаныя тэрміны.

Як паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, агульны штраф у выніку склаў звыш 10 млрд рублёў. Выдадзены таксама прадпісанні аб забароне рэалізацыі харчовых прадуктаў, аб ліквідацыі парушэнняў, прыпынена эксплуатацыя некаторых аб'ектаў. Шэраг службовых асоб прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

■ Фестывалім!

# ПА РЭЦЭПТАХ НАШЫХ ПРОДКАЎ

## На сырным фэсце ў Слаўгарадзе, што на Магілёўшчыне, можна было паласавацца малочнымі прысмакамі, прыгатаванымі па старадаўніх традыцыях


У чарзе па хатні сыр.

**Якіх толькі страў з малака тут не было — сырніцы, скавароднікі, сыры мяккія і цвёрдыя на розны густ і з рознымі напаўняльнікамі!.. І гэта не лічачы іншых прысмакаў у выглядзе булачак з тваражком і брынзай. А як смачна было піць ахаладжанае малако ў 30-градусную спякоту — вось што па-сапраўднаму дапамагае прагнаць смагу. У сырным фэсце, які разгарнуўся каля Слаўгарадскага цэнтра культуры і народнай творчасці, прымалі ўдзел каля 20 сыравараў з Магілёўшчыны, Міншчыны і Віцебшчыны. Арганізатарамі фэсту выступілі Слаўгарадскі райвыканкам і мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра».**

### ЯКІ СЫР ЛЕПШЫ?

Пакуль адны слухалі, як хораша спяваюць творчыя калектывы Слаўгарадчыны, другія не гублялі час дарэмна і змяталі з прылаўкаў смачны, духмяны і вельмі карысны для здароўя тавар. Гандляры ў народных строях з саламянымі вяночкамі на валасах прапаноўвалі адразу па некалькі сыроў розных гатункаў. Напрыклад, у Людмілы Бондаравай з Лапаціч і Галіны Таран са Слаўгарада было па 6 найменняў гэтага прадукту, толькі ў адной з каровінага, а ў другой з казінага малака. Уразіла, што сыры хоць і свае, але прапаноўваліся нібы завадскія, у спецыяльных упакоўках, дзе пазначана назва, цана і нават прозвішча вытворцы.

**Тыя, хто быў на першым фэсце, потым праз сваіх знаёмых заказваюць пэўныя гатункі — з часначком, з кменам.**

Таццяна Гурына — з тых, хто стаяў каля вытокаў сырнай справы. У мінулым яна дырэктар мясцовага фонду «Адраджэнне-Агра», а цяпер — яго актыўны ўдзельнік. На стале перад ёй тварожныя сыры, вельмі запатрабаваны ў мясцовага насельніцтва прадукт. Вось падышла пажылая жанчына, у якой з сумкі ўжо віднелася некалькі жоўтых круглячкоў. «Гэта ж ласунак майго дзяцінства! — яе твар аж заззяў ад радасці. — Сядзіш, бывала, на печцы, смокчаш тварожны «сухарык» — і так смачна, словамі не перадаць».

Таццяна Гурына прызнаецца, што рэцэптамі тварожных сыроў валодала яшчэ яе бабуля. А вось майстар-клас дала маці. «Гэтак калісьці тварог назапашвалі, — тлумачыць яна. — Адціскалі, высушвалі, топленым маслам залівалі і захоўвалі на працягу некалькіх месяцаў».

У Ірыны і Людмілы Ерафеевых з аграгарадка Гіжэнка некалькі разнавіднасцяў сыру сулугуні. Гэтай справай сям'я займаецца 5 гадоў. Рэцэптаў у іх шмат. «Звычайнае малако даводзім да кіпення, дабаўляем воцат, соль і пад прэс, — дзеліцца адным з іх Людміла. — Праз 2 гадзіны можна частавацца. Прыязджайце да нас на аграсядзібу «Эксклюзіў» — не пашкадуеце. Мы нават майстар-клас дадзім».

Для Уладзіслава Баланюка з Лапаціч сыры — прыемнае хобі і спосаб зарабіць дадатковыя грошы. Сам ён працуе ў камунгасе, але сіл хапае і на хатнюю гаспадарку, разам з жонкай трымаюць 2 кароў. Сулугуні ён робіць па асаблівым рэцэпце, які прывёз з роднага Сухумі. Запэўнівае, што такі сыр можна купіць толькі там і ў Слаўгарадзе, дзе ён гандлюе.


Уладзіслаў БАЛАНЮК ведае сакрэты прыгатавання сыроў па-сухумску.

Мужчына ў пілотцы, нібы гандляр з супермаркета, кліча пакаштаваць казінае малако. На Слаўгарадскі фестываль ён з жонкай прыехаў з Дзяржынскага раёна. Пра сыры, запэўнівае, ведае ўсё. У іх сямейнай фермерскай гаспадарцы ажно 300 коз. Па вопыт куды толькі ні ездзілі — у Літву, Польшчу, Швецыю.

— Ну і дзе сыр лепшы? — цікаўлюся я.

— Усе добрыя, — смяецца мужчына. — Яны ж як расліны ў прыродзе, усе розныя!

Але рэцэптам дзяліцца адмаўляецца наадрэз. Смяецца, што ўсё роўна не атрымаецца такі, як у яго. А вось пакаштаваць — калі ласка. Наогул паласавацца сырамі прапаноўваюць усе, таму талерачкі хутка становяцца пустымі — смачна ж! Нездарма яшчэ за некалькі гадзін да афіцыйнага адкрыцця свята аматары сыру ледзь усё не раскупілі.

— Мы нават хвалявацца пачалі, каб наш фэст без сыру не застаўся, — усміхаецца намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Святлана Язерская. — Вельмі вялікай папулярнасцю яны карыстаюцца ў насельніцтва. Тры гады таму, калі ўсё толькі пачыналася, упэўненасці, што атрымаецца, не было. Сыры, асабліва хатнія, хутка псуюцца. Калі іх набываць не будуць, які сэнс імі займацца? Але яны прыйшліся даспадобы і нашым жыхарам, і гасцям. Я ведаю, што тыя, хто быў на першым фэсце, потым праз сваіх знаёмых заказваюць пэўныя гатункі — з часначком, з кменам. Колькасць сыравараў у раёне за тры гады павялічылася з 5 да 15. А галоўнае, што тыя, хто пачынаў, не кінулі. Будзем і далей развіваць гэтую справу. Магчыма, выйдзем на яшчэ больш высокі ўзровень.


Козлік Пяцюня на свяце карыстаўся поспехам.

### ПЯЦЮНЯ ТРАПІЎ У НАДЗЕЙНЫЯ РУКІ

Віталь Варабей, дырэктар мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра», успамінае, як тры гады таму заахвочвалі сельскае насельніцтва займацца сырнай справай, дапамагалі атрымаць дапамогу на развіццё асабістай гаспадаркі. «Фестываль пачынаўся з праекта «Развіццё сельскіх тэрыторый», які падтрымала Праграма малых грантаў Пасольства ЗША ў Беларусі. Мы шукалі сыравараў, якія заняліся б адраджэннем старадаўніх традыцый сыраробства, — кажа ён. — Паказалі, што сыр з пункту гледжання эканомікі — гэта выгадна, што яго можна прадаць у некалькі разоў даражэй, чым звычайнае малако».

Дарэчы, трэці сырны фестываль праходзіў у рамках яшчэ аднаго цікавага праекта — «Зробім фестываль разам» (у рамках праекта «Тандэм-2», які падтрымлівае ALDA — Асацыяцыя агенцтваў мясцовай дэмакратыі з Францыі, а ажыццяўляе фонд Льва Сапегі).

Галоўная ж інтрыга свята захоўвалася да самага канца. Па плошчы перад Цэнтрам культуры выгульвалі сімпатычнага бялюткага козліка Пяцюню — галоўны прыз бяспройгрышнай латарэі. Народ з надзеяй на ўдачу набываў квіткі і фатаграфаваўся з патэнцыйным выйгрышам.

Яго прэзентавала для свята Святлана Мельнічэнка — таксама майстрыха па сырах. Дарэчы, коз Святлана Іванаўна трымае на працягу 44 гадоў. І добра ведае, як карысна ўжываць у ежу казінае малако і сыр. У былым яна настаўніца хіміі і біялогіі. Да сваіх гадаванцаў ставіцца, як да членаў сям'і. «Яму ж усяго 1,5 месяца, — уздыхала яна па Пяцюню. — Толькі б у добрыя рукі трапіў!»

Напэўна, яе пажаданні былі пачуты. Шчаслівай уладальніцай галоўнага прыза стала жыхарка Слаўгарада Алена Лазовікава. У яе гаспадарцы ўжо былі куры і свінні, так што Пяцюня не засумуе.

Не засталіся пакрыўджанымі і іншыя ўдзельнікі латарэі. У якасці падарункаў яны атрымалі кнігі з рэцэптамі слаўгарадскіх сыравараў, сувеніры, салодкія прызы. Свята падтрымаў і мясцовы аўтаперавозчык Міхаіл Коршыкаў, які прэзентаваў 5 паездак да Магілёва. Улічваючы, што квіток каштуе 40 тысяч рублёў, а латарэя ўсяго 10 тысяч, падарунак атрымаўся выгадны.

Галіна Таран, каардынатар «сырнага» праекта адзначыла, што свята адбылося. Быў пастаўлены рэкорд — рэалізавана каля паўтоны (!) хатніх сыроў. Больш за ўсіх прадала Тамара Цвярдоўская — амаль 50 кілаграмаў! Яе сыр «Хатні» «размялі» ў першыя ж гадзіны фэсту.

У гэты ж дзень на Блакітнай крыніцы адбылося яшчэ адно свята — турзлёт, дзе ініцыятыўныя групы, якія працавалі над праектам «Дарожная карта-даведнік «Жывая гісторыя Слаўгарадчыны» сабраліся абмеркаваць далейшую стратэгію развіцця аграэкатурызму ў раёне. Як мы ўжо пісалі, у райцэнтры было здзейснена 5 экспедыцый і сабрана шмат карыснай інфармацыі аб культурных, гістарычных, духоўных традыцыях. Галіна Таран, якая займаецца і гэтым праектам, спадзяецца, што хутка Слаўгарад стане не толькі сырнай, але і турыстычнай сталіцай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара**

■ Самая-самая

# ШЧАСЛІВЫ НУМАР «13»

## Першая «Місіс Беларусь» жыве ў Гомелі

**Пераможца конкурсу прыгажосці сярод замужніх жанчын «Місіс Беларусь-2014» Юлія Перагудава выхоўвае дваіх дзяцей, працуе кансультантам у банку і захапляецца... стральбой. Шчыра кажучы, і раней то там, то тут праходзіла інфармацыя, што беларускі, якія ўжо рэалізавалі сябе як жонкі і маці, прадставілі нашу краіну на тым ці іншым інтэрнацыянальным фэсце для замужніх прыгажунь і нават заваявалі пэўныя ўзнагароды і тытулы. Але на афіцыйным узроўні падобнае мерапрыемства ў Беларусі адбылося ўпершыню. У адрозненне ад конкурсу «Міс Беларусь», тут наяўнасць у пашпарце штампаў аб заключэнні шлюбу і нараджэнні дзяцей не проста віталася — была абавязковай.**

Яшчэ патрабаваліся рост ад 175 см і вышэй, беларускае грамадзянства, пэўная амбіцыйнасць і вялізнае жаданне праявіць сябе ў барацьбе за тытул. Праз строгі (а ў нечым нават і прыдзірлівы) адбор суддзяў са свету моды і індустрыі шоу-бізнесу ў выніку прайшлі ўсяго 15 прэтэндэнтак. А першай сярод лепшых, як паказала фінальнае шоу, зладжанае тэлеканалам АНТ, аказалася ўсяго адна — 31-гадовая Юлія Перагудава, банкаўская супрацоўніца з Гомеля, шчаслівая жонка, а таксама маці дваіх дзяцей — Ігара, якому 4,5 года, і 2-гадовай Веры.

Зрэшты, сама Юлія сябе пераможцай не бачыла да апошняга. Больш за тое, прызнавалася, што на конкурс прыйшла проста па новыя ўражанні і глыток свежага паветра пасля 5 гадоў дэкрэтнага водпуску. Ды і тое на адбор з'явілася не па ўласнай ініцыятыве, а па прапанове мужа Дзмітрыя: ён пад маркай святкавання Дня ўсіх закаханых прывёз жонку ў сталіцу. А тут ёй усміхнулася фартуна, і маладая жанчына трапіла ў лік тых самых 15 удзельніц. Пазнаёміўшыся з імі бліжэй, расказвае Юлія, яна адчула — не, зусім не канкурэнцыю — дух сяброўства, узаемапавагу і падтрымку. «Даведаўшыся, што ў адной з канкурсантак чацвёра дзяцей, я зразумела, што мае двое — гэта зусім няшмат», — прызналася пазней каралева прыгажосці.

Цяпер, калі эмоцыі ад перамогі крыху ўлягліся, «Місіс Беларусь-2014» ацэньвае свой тытул як цудоўную магчымасць прадставіць Беларусь і беларусак на конкурсе «Місіс свету», а таксама на ўласным прыкладзе расказаць і паказаць іншым людзям, ці проста гэта — быць прыгожай і шчаслівай: «Сям'я — гэта галоўнае, што ёсць у чалавека. Вельмі важна разумець, што шчасце не ў грошах, а ў любові, якую трэба берагчы нават праз шмат гадоў шлюбу. Размаўляйце адно з адным, падтрымлівайце, рабіце сюрпрызы нават і пасля 30 гадоў сумеснага жыцця. А яшчэ вельмі важна сачыць за сабой — не толькі ў плане знешнасці, але і ў духоўным. Калі ў жанчыны свецяцца дабрынёй вочы і бачна яе ўнутраная прыгажосць, зусім не важна, за колькі долараў на ёй сукенка».


Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Галоўным сваім дасягненнем «Місіс Беларусь» лічыць не кар'еру, а сям'ю і дваіх дзяцей.

Званне найпрыгажэйшай жонкі і маці, якую абралі тэлегледачы шляхам тэлефоннага галасавання, прынесла Юліі Перагудавай і яе сям'і не толькі маральнае, але і матэрыяльнае задавальненне: «Місіс Беларусь-2014» атрымала ў якасці ўзнагароды эксклюзіўную карону ручной работы з крышталамі Swarovski, жэмчугам і сярэбранымі ніткамі, а таксама спецыяльны прыз ад арганізатараў — падарожжа для ўсёй сям'і на папулярны спа-курорт на Мальдзівах. Дзве віцэ-місіс — імі сталі мінчанка Таццяна Куранкова і магіляўчанка Юлія Красоўская (дарэчы, самая маладая з удзельніц конкурсу) — адзначаны грашовымі прызамі. Акрамя таго, тытул «Місіс Сяброўства» атрымала жонка вядомага тэлевядучага, маці 2 дзяцей Юлія Кур'ян, прыз глядацкіх сімпатый дастаўся Марыне Буяльскай (маладую жанчыну многія могуць памятаць па конкурсе «Міс Беларусь-2008», а ў 2009 годзе яна стала першай віцэ-міс на міжнародным конкурсе прыгажосці «Miss Supranational». — **Аўт.**), а спецыяльны тытул «Місіс сучасная мама» аднагалосна быў прысуджаны маці 4 дзяцей, якая, да таго ж, паспявае весці і рэдагаваць партал пра моду, — Вользе Жадзеевай.

Наступны конкурс «Місіс Беларусь», як плануецца, пройдзе праз 2 гады.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


13-ы нумар, насуперак прымхам, аказаўся для Юліі шчаслівым.


Всегда на высоте

ОАО «Завод «Ветразь»



211730, Витебская обл., г.п. Бегомль, ул. Юхновца
www.zavod-vetraz.by
e-mail: vetraz2008@yandex.ru
тел. 8 (02157) 3-34-44
УНП 300198944

Машина деревообрабатывающая бытовая ИЭ-6009А4.2
Предназначена для механической обработки древесины.



Металлорукав РЗ-ЦХ
Рукав металлический негерметичный (металлорукав), используется для защиты и предохранения проводов, кабелей от механических повреждений и повышения пожаробезопасности.
Соответствует ТУ BY 700008856.106-2010



Инверторный сварочный аппарат АС 150Р
Аппарат сварочный инверторный АС 150Р разработан для ручной электродуговой сварки постоянным током покрытыми плавящимися электродами.



Измельчитель кормов ИК-1
Измельчитель предназначен для переработки зерновых (пшеницы, ячменя, ржи и т.д.), а при установке дополнительного комплекта – корнеплодов и стебельчатого корма.

Строительные гвозди
Гвоздь строительный 2,5 х 50;
Гвоздь строительный 2,5 х 60;
Гвоздь строительный 3 х 70;
Гвоздь строительный 3 х 80;
Гвоздь строительный 4 х 100;
Гвоздь строительный 4 х 120.
Соответствуют ГОСТ 4028-63.



Шайба пружинная
Соответствует ГОСТ 6402-68.

Лебедка ЛС 100А
Лебедка предназначена для перемещения грузов в горизонтальной плоскости, а также выполнения вспашки почвы и окучивания растений на дачных участках и огородах.


■ Ведай нашых!

### ПА МЕДАЛЮ — НА КОЖНАГА!

**Прадстаўнікі беларускай школы заваявалі 7 медалёў на 48-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі. У іх скарбонцы адзін залаты, пяць сярэбраных і адзін бронзавы медаль.**

Уладальнікам «золата» стаў Андрэй Швед (сталічная гімназія № 12). З сярэбранымі ўзнагародамі вярнуліся Дзмітрый Баброў (Ліцэй БДУ), Андрэй Лойка (СШ № 165, г. Мінск), Аляксандра Радчанка (гімназія № 7, Маладзечна), Кацярына Грачова (гімназія № 29, г. Мінск) і Кацярына Рагойжа (сярэдняя школа № 127, г. Мінск). А бронзавым медалём быў узнагароджаны Канстанцін Захарэвіч (Ліцэй БДУ).

Усяго ўдзел у спаборніцтвах узялі 118 школьнікаў з 17 краін: Расіі, Азербайджана, Турцыі, Казахстана, Саудаўскай Аравіі, Балгарыі і іншых. Традыцыйна алімпіяда складаецца з трох тураў: у першым (тэарэтычным) школьнікам даводзіцца рашаць восем абавязковых задач. У другім туры яны выбіраюць 5 задач з 15 прапанаваных. І трэці тур — эксперыментальны. Мендзялееўская алімпіяда школьнікаў па хіміі з'яўляецца пераемніцай Усесаюзнай хімічнай алімпіяды. Прызёры алімпіяды з краін СНД маюць права паступаць без экзаменаў у Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава.

### ХІМІЧНАЯ ШКОЛА БДУ — ЛЕПШАЯ!

**Студэнты хімічнага факультэта БДУ заваявалі два «залаты» і «серабро» на Міжнародным студэнцкім форуме ChemCamp-2014, у рамках якога арганізуюцца хімічная алімпіяда, камандны хімічны турнір і турнір бізнес-кейсаў.**

Арганізатарам форуму выступіў хімічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава пры падтрымцы міжнародных хімічных кампаній.

Абсалютным пераможцам хімічнай алімпіяды стаў магістрант хімічнага факультэта БДУ Алег Шахно. На яго рахунку 36 балаў. Яшчэ адзін прадстаўнік БДУ — пяцікурснік Дзмітрый Шахно — уступіў лідару ўсяго тры балы. Беларускія хімікі ў індывідуальным баі абышлі вельмі моцных сапернікаў з МДУ імя Ламаносава і Расійскага хіміка-тэхналагічнага ўніверсітэта. А ў хімічным турніры ўладальніцай дыплома першай ступені стала каманда Белдзяржуніверсітэта «БелКІ». У пяцёрку пераможцаў увайшлі студэнты трэцяга курса Вольга Самсоненка, Марыя Траўкіна, Аляксандр Міхайлаў, другакурсніца Анастасія Ушэнкіна і чацвёртакурснік Канстанцін Ліванові.

Па ўмовах турніру для ўдзелу ў вочным этапе трэба было прайсці яшчэ ў лютым адборачны завочны тур. Па яго выніках фарміраваўся спіс удзельнікаў выніковага паядынку. Да слова, з 35 адабраных каманд у фінале сустрэліся толькі 9, з якіх тры прадстаўлялі БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»

**с 28 мая 2014 года**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Сроки | | | |
|---|---|---|---|---|
| | до 6 месяцев 90–180 дней | от 6 месяцев до 1 года 181–370 дней | от 1 года до 2 лет 371–740 дней | от 2 до 5 лет 741–2000 дней |
| **Белорусские рубли** | | | | |
| 1 – 10 000 000 | **35,00** | **36,00** | **37,00** | **37,30** |
| 10 000 001 – 50 000 000 | **35,10** | **36,10** | **37,10** | **37,40** |
| 50 000 001 и более | **35,20** | **36,20** | **37,20** | **37,50** |
| **Доллары США, Евро** | | | | |
| 1 – 500 | **4,40** | **4,70** | **5,00** | **5,30** |
| 501 – 5 000 | **4,50** | **4,80** | **5,10** | **5,40** |
| 5 001 и более | **4,60** | **4,90** | **5,20** | **5,50** |
| **Российские рубли** | | | | |
| 1 – 15 000 | **8,40** | **8,80** | **9,10** | **9,30** |
| 15 001 – 150 000 | **8,50** | **8,90** | **9,15** | **9,40** |
| 150 001 и более | **8,60** | **9,00** | **9,20** | **9,50** |

Настоящие ставки применяются:

для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных с 01.08.2013 до 28.05.2014, – с 29.06.2014;

для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключаемых с 28.05.2014, – с 28.05.2014.

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК** 136
**время работы Контакт-Центра Банка**
**8.00–20.00 – рабочие дни**
**8.00–18.00 – выходные и праздничные дни**

**Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.**

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

**с 29 июня 2014 г.**

**Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками** (% годовых)

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 |
| **Белорусские рубли** | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 31,00 | 32,00 | 32,30 | 33,50 | 33,80 | 34,10 | 34,40 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 31,10 | 32,10 | 32,40 | 33,60 | 33,90 | 34,20 | 34,50 |
| 10 000 001 и более | 31,20 | 32,20 | 32,50 | 33,70 | 34,00 | 34,30 | 34,60 |
| **Доллары США** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 |
| **Евро** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,10 | 4,40 | 4,70 | 5,00 | 5,25 | 5,40 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,20 | 4,50 | 4,80 | 5,10 | 5,30 | 5,45 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,30 | 4,60 | 4,90 | 5,20 | 5,35 | 5,50 |
| **Российские рубли** | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,30 | 6,60 | 6,90 | 7,10 | 7,60 | 7,90 | 8,20 |
| 15 001 – 150 000 | 6,40 | 6,70 | 6,95 | 7,20 | 7,70 | 7,95 | 8,30 |
| 150 001 и более | 6,50 | 6,80 | 7,00 | 7,50 | 7,80 | 8,00 | 8,50 |

**Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками** (% годовых)

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
| **Белорусские рубли** | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 9,25 | 9,75 | 10,25 | 10,75 | 11,25 | 11,75 |
| 10 000 001 и более | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 | 12,00 |
| **Доллары США** | | | | | | |
| 1 – 500 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Евро** | | | | | | |
| 1 – 500 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 4,50 | 5,30 | 5,90 | 6,30 | 6,70 | 7,10 |
| 15 001 – 150 000 | 4,80 | 5,50 | 6,10 | 6,50 | 6,90 | 7,30 |
| 150 001 и более | 5,10 | 5,70 | 6,30 | 6,70 | 7,10 | 7,50 |

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК** 136
**время работы Контакт-Центра Банка**
**8.00–20.00 – рабочие дни**
**8.00–18.00 – выходные и праздничные дни**

**Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.**

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

Форма 1 годовой финансовой отчетности

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1.1. | 935 332,6 | 1 007 967,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5.1.2. | 7 798,8 | 4 409,5 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.1.3. | 4 384 117,3 | 4 385 454,3 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.1.4. | 1 244 371,2 | 902 741,2 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.1.5. | 5 818 580,6 | 4 947 884,7 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.1.6. | 48 960 080,8 | 44 385 537,5 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.1.7. | 26,5 | 793,7 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.1.8. | 210 118,6 | 181 199,9 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.1.9. | 3 362 591,6 | 2 703 060,6 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5.1.10. | 1 850,0 | - |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | 5.1.11. | 840 417,6 | 681 966,8 |
| 16 | ИТОГО активы | 11 | 7 | 65 765 285,6 | 59 201 015,8 |
| **17** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | 5.1.12. | 3 529 333,6 | 1 198 044,2 |
| 19 | Средства банков | 1202 | 5.1.13. | 9 484 636,0 | 10 856 567,8 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | 5.1.14. | 35 177 589,9 | 28 891 051,4 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 5.1.15. | 5 575 840,0 | 7 438 960,2 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.1.16. | 174,8 | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | 5.1.17. | 846 457,1 | 906 188,7 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 7 | 54 614 031,4 | 49 290 812,3 |
| **25** | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 5.1.18. | 6 803 591,0 | 6 603 591,0 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 5.1.19. | 510 551,9 | 330 216,6 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 5.1.20. | 1 714 453,8 | 1 429 597,7 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.1.21. | 2 091 697,9 | 1 520 533,2 |
| 31 | Всего капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 11 120 294,6 | 9 883 938,5 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | 5.1.22. | 30 959,6 | 26 265,0 |
